ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-91.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 13 мая 1930 г.
№ 110 (3708)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Пачаць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі

Зараз перад партыйнымі і савецкімі арганізацыямі, перад усёй нашай амадзкасьцю паўстае новая, надзвычай адказная задача — пачаць ...ачасовую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Праўда, у БССР па кліматычных ...овах збор ураджаю пачынаецца ...ыху пазьней, чым у радзе іншых ...ёнаў Саюзу. Аднак, гэта не дае нам ...ава на адтэрміноўку, «перадышку». ...льга ўпускаць часу. Рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ўборкі ...жна пачаць праводзіць у жыцьцё ...пер-жа, не чакаючы сканчэньня ...ўбы.

Уборачная кампанія гэтага году бу... праходзіць ва ўмовах жорсткай ...ясавай барацьбы. Пасьпяховая ...орка ўраджаю, якая наглядна па... ...жа рэзультаты калектыўных мэта... ...ў работы, перавагу і большую пра...цыйнасьць абагуленай гаспадаркі, ...ачна ўмацуе калгасы. Таму няўхіль... ...клясавы вораг прыкладзе ўсе сілы, ...б перашкодзіць пасьпяховаму завяр...шэньню сельска-гаспадарчай кампаніі ...тага году.

Калгасы зараз займаюць 18 проц. ...ельнай плошчы рэспублікі. Упяр... ...лню нам даводзіцца калектыўна ...іраць ураджай у такіх вялікіх разь...рах. Мы спаткаем па гэтым шляху ...мала труднасьцяй. Трэба быць га...тымі да іх перамаганьня.

Правільная арганізацыя працы ў ...тасах у часе ўборкі набывае вялі... ...значэньне. Ва ўборачных работах ...вялікай колькасьці ўжываецца жа... ...ная праца. Нам трэба ня толькі ўлі... ...ць практыку сяўбы, ня толькі зьні... ...ць недахопы ў арганізацыі пра... ...выяўленыя ў часе веснавых ра... ...але і падняць, арганізаваць но... ...ы пласты работнікаў-жанчын. Ма... ...ая работа сярод жанчын павінна ...ць узьнята на належную вышыню. ...ным партыйным арганізацыям пе... ...одна зьвярнуць па гэту галіну ра... ...ы сур'ёзную ўвагу.

Калегія Наркамзему СССР прапа... ...ала БССР закончыць рамонт убо... ...ных машын це пазьней 1 ліпеня. ...рамонту машын трэба прыступіць ...аз-жа. Вопыт скарыстаньня чыгу... ...ных майстэрань для рамонту па... ...нага інвэнтару мэтазгодна пашы... ...ць і на ўборачную кампанію.

Побач з гэтым вельмі важна свая... ...овае забесьпячэньне новымі машы... ...і як абагуленага, так і індывідуа... ...нага сэктару. Нельга дапусьціць ...аваранья нашых машына-гандлё... ...х арганізацый і нашоўнага скары... ...ньня крэдытаў па с.-г. інвэнтар, ...мела месца ў часе падрыхтоўкі ...пасеўнай кампаніі.

Нельга ўпускаць з-пад увагі інды... ...альнага сэктару. Вытворчую да... ...гу калгасаў і саўгасаў бядняцкім ...аламоцным індывідуальным гас... ...даркам вельмі важна працягваць і ...час збору ўраджаю.

Трэба памятаць таксама аб неда... ...чальнасьці перагібаў пры вызна... ...ньні сенажацяй гаспадаркам, якія ...ўвайшлі ў калгасы. Найменшыя ...ушэньні партыйныя лініі ў гэтым ...аньні павінны спыняцца ў самым ...адку.

Як вядома, азімыя, якія былі засе... ...ў індывідуальным парадку пядаў... ...ўвайшоўшымі ў калгасы, нале... ...ць гэтым пасеўшчыкам. У пекато... ...мясцох многія такія калгасьнікі ...авяюцца за сумесную работу ў ...збору азімых, якія ім непасрэдна ...ежаць. Само сабою зразумела, што ...ным арганізацыям трэба ўсяляк ...хвочваць гэтае пачынаньне.

Нацыялістычнае спаборніцтва, даў... ...ў часе сяўбы ва многіх калгасах ...каналыя рэзультаты, павінна стаць ...ўным мэтадам нашай работы ва ...рачную кампанію.

Шырока скарыстаўшы практыку ...ёўнай кампаніі, мабілізаваўшы ...гу савецкай грамадзкасьці, давёў... ...пляны да кожнага калгасу і два... ...мы можам і абавязаны дабіцца ...сымальнага посьпеху ў ходзе ўбо... ...най кампаніі.

Прывітаньне „Зьвязьдзе“

...гульна-гарадзкі сход рабкораў Мен... ...сабраўшыся ў дзень друку для ...парэньня пытаньня аб падрыхтоў... ...да XIII зьезду КП(б)Б і XVI ...зду УсеКП(б), піле шчырае пралета... ...кае прывітаньне змагару за сацы... ...стычнае будаўніцтва, правадніку ...льшавіцкіх ленінскіх ідэй у шырокія ...ясы рабочае клясы і бядняцка-серад... ...цкія працоўныя масы, — газэце «Зьвязда».

...Шчай жыве цэнтральны орган КП(б)Б ...аз. «Зьвязда» і паражае сваім вострым ...там усіх ворагаў, якія перашкаджа... ...ь сацыялістычнаму будаўніцтву.

Прэзыдыум сходу.

ЗМАГАЦЦА ЗА КОЛЬКАСЬЦЬ і ЗА ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ!

Тэмп сяўбы бульбы і тэхнічных культур павінен быць узмоцнены

Якасьцю сяўбы ня цікавяцца

МСЦЬСЛАЎ, Аршаншчына.

У калгасах раёну плян засеву раньніх культур выканан больш, як на 50 проц. Некаторыя калгасы ўжо закончылі сяўбу збожжавых культур. Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам актыўнасьці і дысцыплінаванасьці калгасьнікаў. Так, напрыклад, у самым вялікім калгасе раёну імя Чарвякова, які яднае 6 вёсак Старасельскага сельсавету ў ліку 172 гаспадарак, на працягу ўсяго часу палявых работ ня было ніводнага выпадку нявыхаду на работу бяз уважлівых прычын.

Пасьпяховая праца калгасаў выклікала прыліў новых членаў, зварот тых беднякоў і сераднякоў, якія раней выйшлі з калгасаў. Калгас імя Чарвякова прыняў 28 новых членаў, калгас «Чырвоны Сьцяг» — 11, калгас «Ясны Дзень» —5 і г. д. Асабліва павялічыўся прыліў у калгасы пасьля папулярызацыі льгот калгасам і артыкулу тав. Сталіна «Адказы т. т. калгасьнікам». У вёсцы Дзесякіты арганізаваўся новы калгас, у які ўвайшло 19 гаспадарак.

Побач з добрымі колькаснымі вынікамі трэба адзначыць недахопы якаснага парадку. Толькі ў пязначнай частцы калгасаў робіцца пасеў радковымі сявяркамі. Тлумачыцца гэта адсутнасьцю ў раёне сявярак. Пратручваецца ня ўсё насеньне, а толькі пшаніца і ячмень. Іншыя культуры пратручваюцца ў пязначнай частцы калгасаў. У радзе калгасаў завезена вялікая колькасьць мінэральных угнаёньняў — фасфарытнай мукі. Але-ж угнаёньне пад яравыя культуры чамусьці ня ўсюды скарыстоўваецца. Яшчэ не распачата скарыстаньне сабранага попеду. Бацнаваньне глебы таксама пад пагрозай зрыву. Толькі зараз распачаты досьледы глебы на прадмет вапнаваньня. Дрэнная справа і з вызначэньнем глебы пад асобныя культуры. Агранамаў у калгасах няма. Яны ўвесь час сядзяць у горадзе і ўсё яшчэ займаюцца складаньнем розных плянаў і зводак. Якасьцю сяўбы ў раёне ніхто ня цікавіцца.

Трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на якасны бок сяўбы ў калгасах і індывідуальным сэктары. Трэба памятаць, што ад гэтага залежыць выкананьне дырэктывы аб павялічэньні ўраджайнасьці.

Н. Ж.

Да калгасу „Бальшавік Беларусі“ далучылася 110 новых гаспадарак

КЛІМАВІЧЫ, МАГІЛЕЎШЧЫНА.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ДА КАЛГАСУ «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ» ДАЛУЧЫЛАСЯ 110 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК З ВЁСКІ СУДЗІЛЫ, КЛІМАВІЦКАГА РАЁНУ, НА ПЛОЩЧЫ ЗВЫШ 600 ГЭКТ. ЯРАВЫ КЛІН ЯК КАЛГАСАМ «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ», ТАКСАМА І ЎВАЙШОЎШЫМІ ГАСПАДАРКАМІ Ў КАЛГАС ЗААРАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ. ДА ГЭТАГА ЧАСУ СКОНЧАНА З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ СЯЎБА АЎСУ І ПШАНІЦЫ, ЗАРАЗ РАСПАЧАТА ПРАЦА ПА ЗАСЕВЕ БУЛЬБЫ.

КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН ПА БУЛЬБЕ—НА 14,6 проц., ПА ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУРАХ—НА 11 проц.

Сяўба бульбы і тэхнічных культур у калгасах БССР ідзе недапушчальна марудным тэмпы, прычым калгасы значна адстаюць ад індывідуальнага сэктару.

Так, плян сяўбы бульбы ў Мазырскай акрузе выканан у індывідуальным сэктары на 37 проц., у калгасах—на 22,1 проц., па Бабруйскай акрузе індывідуальныя гаспадаркі выканалі плян на 25,1%, калгасы — на 13%; па Магілеўскай акрузе — індывідуальны сэктар — на 29,1%, калгасы — на 13,2%; па Гомельскай акрузе — індывідуальны —на 29,1%, калгасы — на 17,4%, па Полацкай акрузе — індывідуальны сэктар — на 6,8%, калгасы — на 5,1%.

У сярэднім па 5 акругах плян засеву бульбы выкананы індывідуальнымі гаспадаркамі на 25,3%, калгасамі на 14,6%.

Такое-ж становішча мы маем і з тэхнічнымі культурамі. Плян сяўбы тэхнічных культур па Мазырскай акрузе выканан індывідуальнымі гаспадаркамі на 42,6%, калгасамі — на 36, 7%; па Бабруйскай акрузе: індывідуальным сэктарам — на 13%, калгасамі — на 10,2%; па Магілеўскай акрузе: індывідуальным сэктарем — на 9,1%, калгасамі — на 5,1%. Толькі па Гомельскай акрузе калгасы пайшлі некалькі ўперад: яны выканалі плян на 20,3%, супроць 12,5% у індывідуальным сэктары.

У сярэднім па 5 акругах плян сяўбы тэхнічных культур выкананы ў калгасах на 9,2%, у індывідуальным сэктары — на 11%.

Прыведзеныя даныя гавораць аб імкненьні калгасаў выканаць свой пасеўны плян за лік больш лёгкіх культур, аб ігнараваньні імі больш працаёмкіх культур (бульба, лён, канаплі).

Паасобныя калгасы, матывуюць слабы тэмп сяўбы бульбы тым, што нібыта не хапае насеннай бульбы. Гэтыя матывы абсалютна не адпавядаюць сапраўднасьці, бо па лініі загатоўчых арганізацый і саўгасаў вызначаны спэцыяльныя фонды насеннай бульбы для калгасаў і індывідуальных гаспадарак. Фонды пакуль што яшчэ ня выкарыстаны. З гэтай прычыны ніякіх гутарак аб недахваце насеннай бульбы ня можа быць.

Да канца сяўбы бульбы і тэхнічных культур засталося некалькі тыдняў. Гэты час калгасы павінны выкарыстаць для выпраўленьня сваёй памылкі. Трэба прыняць рашучыя меры да фарсаваньня засеву бульбы ў калгасах. Райкалгассаюзы, райпаляводсаюзы, сельсаветы павінны зараз-жа праверыць, як выконваецца плян засеву па азначаных культурах у кожным калгасе.

С. Г.

ЯК СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ТРАКТАРЫ У БЕЛАРУСКІХ КАЛГАСАХ

Увосень мінулага году ў калгасах БССР быў 91 трактар. Зараз нашы калгасы абслугоўваюць 21 трактарная калёна —275 трактараў.

Калгасы Бабруйшчыны маюць 3 трактарныя калёны — 40 трактараў; калгасы Віцебшчыны — 2 трактарныя калёны — 19 трактараў; Гомельшчыны — 2 трактарныя калёны — 29 трактараў, Магілеўшчыны — 5 трактарных калён —83 трактары, Полаччыны — 2 трактарныя калёны — 28 трактараў; Меншчыны — 3 трактарныя калёны — 38 трактараў; Аршаншчыны — 2 трактарныя калёны — 19 трактараў.

У бягучым месяцы калгасы БССР атрымаюць яшчэ 35 трактараў розных марак (у тым ліку 25 трактараў эа здадзены ўтыль). Гэтыя трактары будуць разьмеркаваны паміж раёнамі наступным чынам: Лёзьнянскі раён (Віцебшчына) атрымае 5 трактараў, Хоцімскі раён (Магілеўская акруга) — 5 трактараў, Сураскі раён (Віцебская акруга) — 5 трактараў, Самахвалавіцкі раён (Меншчына) — 7 трактараў. Касьцюковіцкі раён (Магілеўшчына) — 2 трактары, Ветрынскі раён (Полаччына) — 5, Жлобінскі агракамбінат — 2, Лядзянскі агракамбінат (Аршаншчына) — 3 і калгас «Лепінскі Шлях» (Клімавіцкі раён, Магілеўшчына) — 1 трактар.

У ліпені будуць атрыманы яшчэ 67 трактараў «Фардзон - Пуцілавец». Такім чынам, у ліпені лік трактараў у калгасах будзе складаць 377 адзінак.

***

Як выкарыстоўваюцца трактары ў калгасах?

Весткі Белкалгасцэнтру сьведчаць, што ў справе выкарыстоўваньня трактараў дасягнуты значны зрух у бок поўнай нагрузкі трактарных калён. Аспоўная маса трактараў працуе ў дзьве зьмены — ад 16-ці да 20 гадзін у суткі. Рэшта часу выкарыстоўваецца для змазкі і агляду трактараў.

Прадукцыйнасьць трактараў даволі высокая. Гусяніччны трактар маркі «Манарх» за 10 гадзін узорвае мінімальна 10 гэктараў. Узораньне аднаго гэктару пры рацыянальным выкарыстаньні трактара абходзіцца максімальна ў 5 рублёў. Між тым, узораньне аднаго гэктару звычайным калёсным дзесяцісэкцыйным трактарам каштуе мінімальна 7 рублёў. 4-га мая Белкалгасцэнтр атрымаў для Магілеўскай акругі 26 трактароў маркі «Манарх». Гэтыя трактары разьмеркаваны і працуюць ужо ў наступных раёнах: Касьцюковіцкім раёне — 9 трактараў, Лупалаўскім —8, Магілеўскім — 9.

Некалькі зьменшылася нястача трактарыстых. На сёньняшні дзень мы маем 550 трактарыстых. Патрабуецца-ж калгасам 700 чалавек. Белкалгасцэнтр даў дырэктыву ўсім калгасам вылучыць больш здольных калгасьнікаў і калгасьніц для практычнага іх навучаньня працаваць на трактарах. Гэтае мерапрыемства праз некаторы час ліквідуе нястачу трактарыстых.

У некаторых мясцох, аднак, рацыянальнае скарыстоўваньне трактараў яшчэ не паладжана. Менскі агракалгасаюз і акрпаляводсаюз вельмі мала ўвагі ўдзяляюць рабоце трактарных калён. 29-га красавіка ў Сьмілавіцкі раён прысланы 8 трактараў. Гэтыя трактары, да апошняга часу, яшчэ поўнасьцю не выкарыстоўваюцца — працуюць у адну зьмену.

У Аршанскай акрузе былі выпадкі, калі здадзеныя для рамонту трактары доўгі час не забіраліся.

Г. С.

Перад вялікімі эканамічнымі баямі ў Нямеччыне

НАСТУПЛЕНЬНЕ НА РАБОЧУЮ КЛЯСУ ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ

КАНФЛІКТ У МЭТАЛЮРГІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

БЭРЛІН, 12. У мэталюргічнай прамысловасьці Нямеччыны прадпрыемцамі скасаваны калдагавары, якія ахапляюць звыш 600 тысяч рабочых. У Рурскай вобласьці прафсаюзныя арганізацыі пад націскам рабочых мас вымушаны былі адмовіцца ад кабальнага дагавору з прадпрыемцамі. Апошнія пагражаюць скарачэньнем вытворчасьці на 20-25 проц. і звальненьнем дзесяткаў тысяч рабочых. Прадпрыемцы высунулі таксама пытаньне аб скарачэньні зарплаты ня гледзячы на тое, што дагавор аб зарплаце заключаны да верасьня. Рэфармістыя ня высунулі ў процівагу патрабаваньня аб павышэньні зарплаты. Прадпрыемцы таксама адхілілі патрабаваньне аб 48 гадзінным рабочым тыдні. Зараз 160 тысяч мэталістых Руры працуюць ад 52 да 57 гадзін.

«Ротэ Фанэ» заяўляе, што прадпрыемцы па ўсім фронце наступаюць на рабочых мэталюргічных раёнаў Нямеччыны. Рэфармістыя абмяжоўваюцца хадайніцтвамі ў рэйхстаг, лістамі да міністраў і г. д. 600 тысяч мэталістых зьявяцца непрамоўнай сілай, калі згуртуюцца пад рэвалюцыйным кіраўніцтвам і арганізавана дадуць адпор прадпрыемцам. (ТАСС).

60 ТЫСЯЧ ГАРНЯКОЎ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗВАЛЬНЕНЬНЯ

КРЫЗІС У КАМЕНАВУГАЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

БЭРЛІН, 11. У сувязі з надыходзячымі масавымі эканамічнымі баямі ў Паўночна-Заходнім прамысловым раёне Нямеччыны прадпрыемцы пры падтрыманьні рэфармісцкіх прафбюракратаў пачалі рашучае наступленьне на рабочых. На заводах «Фэнікс»у Дусэльдорфе прадпрыемцы звольнілі 120 рабочых за ўдзел у камуністычнай дэманстрацыі 1-га мая. За ўдзел у першамайскіх забастоўках звольнены рэвалюцыйныя члены заўкомаў па заводах «Вэрнэр» у Дульканэ, на радзе дробных мэталюргічных прадпрыемстваў у Гагэне і ў многіх іншых мясцох.

Міжнародны сталёвы картэль, які ўжо скараціў сваю вытворчасьць на10 проц., абвясьціў аб тым, што ў бліжэйшы час вытворчасьць будзе скарочана на 25%, што пацягне за сабой звальненьне дзесяткаў тысяч рабочых. **Прадпрыемцы каменавугальнай прамысловасьці Рурскай вобласьці намераны звольніць 60 тыс. гарнякоў.** (ТАСС).

Становішча ў Індыі напружанае

ЛЁНДАН, 12. Становішча ў Шалапуры настарому трывожнае. Наўпраці выданай забароне зьбірацца больш 5 чал., учора ў горадзе адбыўся рад мітынгаў, якія разганяліся сіламі войска. Для разгону сабраўшыхся прыбыло 5 грузавікоў з салдатамі. Як падаюць газэты, разгон прайшоў быццам-бы без ахвяр. У Пэшэвар і Пуні высланы новы батальён. Фабрыкі, якія знаходзяцца ў горадзе, не працуюць. Магазыны зачыненыя.

У Дэлі зараз сходы забаронены, газэты ня выходзяць, у горадзе быццам-бы паступіў спакой. У час сутычак з паліцыяй 6-га мая, абвешчанага днём жалобы ў знак пратэсту супроць арышту Гандзі, былі забіты 4 і паранена 112 дэманстрантаў і 39 паліцэйскіх. (ТАСС).

УТРАТА ІНДЫІ—ДЛЯ АНГЛІІ ПАГІБЕЛЬ

БЭРЛІН, 11. У артыкуле па пытаньні аб становішчы ў Індыі нацыяналістычная «Дэйчэ Альгемэйне Цэйтунг» прыводзіць рад даных, якія выразна ілюструюць усё вялізарнае значэньне, якое мае Індыя для Брытанскай імпэрыі. Індыя штогодна купляе ў Англіі на 800 млн. марак бавоўняных тканін і на 400 млн. марак прадуктаў мэталюргічнай прамысловасьці. Дзяржаўны доўг Індыі, большая частка якога знаходзіцца ў руках ангельскіх прадпрыемцаў, раўняецца прыблізна 20 мільярдаў марак. Брытанскія капіталькладаньні ў Індыі перавышаюць 7½ мільярдаў марак. З агульнага капіталу ўсіх індыйскіх акцыянэрных таварыстваў, які раўняецца амаль 9½ мільярдам марак, звыш 8 мільярдаў марак складаюць таварыствы, зарэгістраваныя ў Англіі і якія належаць ангельцам. Індыя штогодна выплачвае 840 млн. марак пэнсіі брытанскім чыноўнікам. Акрамя таго, брытанскія афіцэры, якія ўходзяць у адстаўку з армії, і якія жывуць у Англіі, атрымліваюць пэнсіі ад індыйскага ўраду. На гэтыя пэнсіі індыйскае насельніцтва выплачвае 80 млн. марак у год. Гэтыя лічбы поўнасьцю апраўдваюць вывад газэты, што ўтрата Індыі азначае для Англіі пагібель яе сусьветнае магутнасьці і матар'яльных батальёнаў, якія зрабілі Англію вялікай.

АПОШНІЯ МАСКОЎСКІЯ НАВІНЫ

НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ ПАРТАСЬВЕТЫ ПРЫ КУЛЬТПРОПЕ ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 12. (Па тэлефону ад наш. кар.). Пры Культпропе ЦК УсеКП(б), пад старшынствам тав. СТЭЦКАГА, адкрылася нарада па партасьвеце. Нарада абгаворыць чарговыя задачы партасьветы і пэрыядычнай падрыхтоўкі партактыву, вызначыць плян летняй перападрыхтоўкі партактыву і плян выданьня падручнікаў для партасьветы. Нарада набывае асабліва вялікае значэньне для ўдакладненьня ўсёй сыстэмы партасьветы, зьмест якой значна ўскладніўся ў сувязі з бягучымі задачамі партыі.

Сетка партасьветы за апошні год значна вырасла. У 1928-29 г. ва ўсе віды партвучобы, акрамя дзяржаўнай сеткі (камвузы, савпартшколы) было ўцягнута звыш 862.000 слухачоў, а ў 1929-30 годзе — звыш 1.147 тыс. Лік беспартыйных, ахопленых партвучобай, павысіўся ад 28 да 40 проц.

МА ДЭ-ГУЙ У Т.Т. ЛІТВІНАВА І КАРАХАНА

МАСКВА, 11. Ма Дэ-гуй, поўнамоцны прадстаўнік Кітайскай рэспублікі на савецка-кітайскай канфэрэнцыі, наведаў выконваючага абавязкі народнага камісара замежных спраў т. ЛІТВІНАВА і нам. народнага камісара замежных спраў т. КАРАХАНА. (ТАСС).

ПЕРШЫ ЦЯГНІК ПА ТУРКСІБУ ПРЫБЫЎ У ТАШКЕНТ

Паводле атрыманых вестак у Маскве, у Ташкент прыбыў простым шляхам з Сібіры па Туркестана - Сібірскай чыгунцы першы цягнік са збожжам і лесам.

Ангельска-савецкі гандлёвы дагавор непакоіць францускую буржуазію

ЛЕВА-БУРЖУАЗНАЯ «ВОЛОНТЭ» ЗА ПЕРАГЛЯД ПАЗЫЦЫЙ Ў ФРАНКА-САВЕЦКІХ АДНОСІНАХ

ПАРЫЖ, 12. Лева-буржуазная «Волонтэ» зазначае на неабходнасьць Францыі перагледзець свае пазыцыі ў пытаньні аб франка-савецкіх адносінах. Адсутнасьць франка-савецкага гандлёвага дагавору моцна тармозіць разьвіцьцё франка-савецкіх эканамічных адносін. Увозныя мыты на савецкія тавары ў два і нават у тры разы вышэй, чым мыты на тавары, якія ўвозяцца з іншых краін. Нядаўні працес надробшчыкаў вэксалёў на чале з Літвінавым, справа Куцепава павялічваюць рызыку СССР пры камэрцыйных аперацыях з Францыяй. Адсутнасьць адпаведных крэдытаў таксама ніспрыяюча ўплывае на пашырэньне франка-савецкага гандлю. Гэта б'е па інтарэсах францускай прамысловасьці і спажыўцоў, якія зацікаўлены ў савецкім сырцу, паўфабрыкатах і с.-г. прадуктах. Ня гледзячы на ўсе гэтыя перашкоды гандлёвы зварот Францыі з СССР у першым квартале 1929-30 году дасягнуў 400 млн. франкаў, замест 250 млн. франкаў у адпаведны пэрыяд папярэдняга года.

Пункт погляду некаторых колаў, — заяўляе газэта, — што да заключэньня гандлёвага дагавору павінна быць урэгулявана пытаньне аб царскіх даўгох, глыбока памылкова. Жыцьцё не чакае, пакуль будуць урэгуляваны гэтыя разгалосьсі. З труднасьцямі, але франка-савецкі гандаль разьвіваецца. І калі ён знаходзіцца пад пагрозай зрыву, то не таму, што ня ўрэгуляваны гэтыя даўгі, а з прычыны адсутнасьці гандлёвага дагавору і наяўнасьці тэй палітыкі дробных «булавачных уколаў», якія вымушаюць СССР абыходзіць францускі рынак. (ТАСС).

НА ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ ВВА

Увесь дзень 12-га мая былі спрэчкі па дакладу тав. **Уншліхта.** Выступаючыя таварышы адзначалі правільную лінію Рэвваенсавету Саюзу і ПУР'у ў пытаньнях вайсковага будаўніцтва. Шырока абгаворваліся пытаньні мэханізацыі армії, яе тактычнай і баявой падрыхтоўкі.

Рад таварышоў падрабязна спыняўся на правядзеньні Рэвваенсаветам і ПУР'ам генэральнай лініі партыі. Дэлегаты канстатавалі, што і Рэвваенсавет, і ПУР сваячасова і выразна праводзілі ў армейскіх умовах палітыку цартыі, мабілізуючы армейскія партыйныя арганізацыі на барацьбу з усімі хістаньнямі і ваганьнямі ад генэральнай лініі партыі.

Дэтальнаму абгаварэньню падпала пытаньне павароту партыйных арганізацый тварам да баявой падрыхтоўкі, далейшага разьвіцьця ў армії ўдарнага руху і сацспаборніцтва.

Перад абедзеным перапынкам канфэрэнцыю вітала дэлегацыя 7-й Самарскай кавдывізіі. Ад імя байцоў і начальніцкага складу дывізіі выступіў на украінскай мове курсант палкавой школы №-скага кавпалка Іншук, які запэўніў канфэрэнцыю, што байцы і начскład дывізіі ў любы момант гатовы па закліку партыі і савецкай улады пайсьці на абарону межаў Савецкага Саюзу.

Ад імя 149 таварышоў, якія падаюць калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю таварыў камандзір №-скага кавпалка тав. Гайдукоў:

«Перад тварам усё ўзмоцненай ваеннай небясьпекі, перад тварам вялізарнейшых задач, якія стаяць перад камуністычнай партыяй па будаўніцтве сацыялізму, мы, беспартыйны начальніцкі склад, і байцы 7-й Самарскай кавдывізіі цалкам і поўнасьцю, падзяляючы і падтрымліваючы палітыку партыі, прызнаючы яе статут і праграму, мы, у ліку 149 чалавек, падаем калектыўную заяву аб прыёме нас у рады камуністычнай партыі».

Дэлегаты канфэрэнцыі стоячы віталі гэту калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю.

Каля клюбу Карла Маркса былі выстраяны ў конным страі часьці кавалерыйскай дывізіі. З балькону байцоў кавалерыстых вітаў намесьнік старшыні Рэвваенсавету Саюзу і Народнага камісара па вайсковых і морскіх справах тав. **Уншліхт.** Яго прамова была пакрыта воклічамі «ура» у гонар Рэвваенсавету, яго кіраўніка тав. Варашылава, тав. Уншліхта і 9-й партыйнай канфэрэнцыі ВВА.

На вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыю віталі дэлегацыі ад 3-й раённай партыйнай канфэрэнцыі Кастрычніцкага раёну, заводу «Бальшавік» і асоавіяхімаўскай арганізацыі.

Учора канфэрэнцыю віталі рабочыя заводу «Камінтэрн», Меншвею, першай дзяржаўнай друкарні імя Сталіна, прадстаўнікі байцоў і начальніцкага складу бабруйскага і слуцкага гарнізону.

У сваіх выступленьнях усе заклікаюць да аднаго — «Выканань і перавыканань прамфінплану», «Яніцгоду ў чатыры гады», «Быць гатовым даць рашаючы адпор ворагу».

ІНДЫЯ ПРЫЙШЛА Ў РУХ

Вуліцы Бамбэі, Чытагонгу, Мадраса, Лагоры абліты крывёй. У Пэшэвары, Далі паўстаўшыя народныя масы аўладалі горадам. Наўкола Бамбэі і Калькуты пачаліся выступленьні сялян,—гром стрэлаў у гарадох прабудзіў забітага, галоднага бедака—індыйскага мужыка. Нават напоўпершабытныя плямены прабавалі пайсьці са зброяй у руках у горад. У ПЭШЭВАРЫ, мусульманскім горадзе, ЧАСТКА ІНДЫЙСКІХ ВОЙСК ПЕРАЙШЛА НА СТОРАНУ ПАЎСТАЎШАГА НАРОДУ. У гарадох Індыі купцы зачыняюць крамы, рамесьнікі зачыняюць майстэрні, спыняюцца фабрыкі: тэкстыльныя прадпрыемствы Бамбэі, джутавыя фабрыкі Калькуты, дапо Вялікай Індыйскай чыгункі бастуюць, на залатых прысках Майсгоры, капальнях у Мадрасы, Шалапуры, Карачы—забастоўкі. Па ўсёй краіне чуцен вокліч: «ДАЛОЎ ІМПЭРЫЯЛІЗМ. НЯХАЙ ЖЫВЕ РЭВАЛЮЦЫЯ». Мільённыя масы Індыі выступаюць на барацьбу з імпэрыялізмам.

НА ЧАЛЕ МАС, ЯКІЯ ЗМАГАЮЦЦА, ІДУЦЬ РАБОЧЫЯ, большасьць забітых і параненых складаюць яны. У Пэнджабе 25.000 сялян на канфэрэнцыі сказалі: «МЫ НЕ БАЛЬШАВІКІ. АЛЕ, КАЛІ БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ БЕЛЫХ ПАНОЎ, СУПРОЦЬ ПАМЕШЧЫКАЎ, СУПРОЦЬ ПАДАТКАЎ І ЛІХВЯРОЎ, КАЛІ БАРАЦЬБА ЗА КАВАЛАК ХЛЕБА, ЗА ЧАЛАВЕЧАЕ ЖЫЦЬЦЁ ЁСЬЦЬ БАЛЬШАВІЗМ, ДЫК БАДАЙ МЫ ЎСЕ БАЛЬШАВІКІ».

«Рабочы» ўрад Макдональда вядзе крывавую бязьлітасную барацьбу супроць індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху. Уведзены зноў славуты бэнгальскі дэкрэт, які дае права ўладам бяз суду і без прад'яўленьня якіх-небудзь абвінавачаньняў арыштоўваць і высылаць у канцэнтрацыйныя лягеры. Уведзены закон з 1910 года, які дае права ўладам усімі спосабамі душыць прэсу. У ПРАЦЯГУ АДНАГО ДНЯ БЫЛО ЗАКРЫТА 100 ГАЗЭТ. ЗАБІТЫЯ НАЛІЧВАЮЦЦА СОТНЯМІ, ПАРАНЕНЫЯ — ТЫСЯЧАМІ, АРЫШТАВАНЫЯ —ДЗЕСЯТКАМІ ТЫСЯЧ.

Супроць рэвалюцыі змагаецца ня толькі ангельскі імпэрыялізм. Тубыльныя князі, якія пануюць над 70 млн. працоўных індусаў, стаяць цалкам і поўнасьцю на баку ангельскага імпэрыялізму. Памешчыкі Бенгаліі, Мадраса, злучаных правінцый, цэнтральных правінцый зварачаюцца да ангельска-індыйскіх улад і патрабуюць устанаўленьня «парадку», аднаўленьня «закону». Ліхвяры, буйная буржуазія, частка буйной прамысловай буржуазіі, зьвязанай з ангельскімі банкамі — усе яны просяць ангельскі ўрад хутчэй апублікаваць даклад камісіі Саймона аб перазглядзе індыйскай канстытуцыі. Яны просяць «рабочы» ўрад супакоіць бушуючае мора масавай барацьбы. Рабочая кляса зьяўляецца найбольш актыўнай, пасьлядоўнай, вядучай сацыялістычнай сілай да лягеру рэвалюцыі. Пралетарыят змагаецца ўжо за гэгэмонію ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе. Сялянства ўцягваецца ў бай, але асноўная яго маса яшчэ ня выступіла. Затое гарадзкая дробная буржуазія ўжо прыйшла ў рух, складаючы ў гарадох разам з рабочымі асноўную масу забастоўшыкаў, дэманстрантаў, а дзе-нідзе і паўстанцаў.

Іменна гэта сваеасаблівая абстаноўка клясавых сіл і зрабіла магчымым здрадніцкую тактыку індыйскага нацыянал - рэфармізму, добра задуманых і спрытна разьлічаных манэўраў Ганды. Нацыянальны кангрэс зьяўляецца буржуазнай, нацыянал - рэфармісцкай арганізацыяй здрадніцтва рэвалюцыі. І ангельскі імпэрыялізм даў нацыянальнаму кангрэсу поўную магчымасьць уступіць у барацьбу з пралетарыятам за гэгэмонію ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе. Нацыянальны кангрэс высунуў для гэтай мэты Ганды, а ў якасьці яго спадручнага — Джавахарлала Нору. Гандысцкі лёзунг «пасьўнага супрацьўленьня», без гвалтаў, зьяўляецца для ангельскага імпэрыялізму выратаваньнем перад небясьпекай масавага рэвалюцыйнага выступленьня. Ганды спрабаваў павесьці за сабой рэвалюцыйныя масы ў сапоных балотах, прабаваў дэзарганізаваць, разбройць рэвалюцыю. Ганды зварачаўся да «рабочага» ўраду ня вывозіць ангельскія войскі з Індыі, бо ён нават не прабаваў утойваць, што ён больш баіцца рабоча-сялянскіх мас, чым імпэрыялізму. Ён бёў рэвалюцыйныя масы да паражэньня, разбройваў іх, каб на сьпіне рабочых, сялянскіх і, нават, дробна-буржуазных мас індыйская буржуазія магла заключыць гнілы кампраміс з імпэрыялізмам.

**Калі здрадніцкая, контр-рэвалюцыйная тактыка Ганды стала зразумелай масам, ангельскі імпэрыялізм арыштаваў Ганды, зрабіў яго мучаньнікам, каб выратаваць ад канчатковага банкрутства. Але манэўры Ганды і манэўры імпэрыялізму не маглі і ня змогуць выратаваць гандызм і нацыянальны кангрэс ад выкрыцьця ў

Партыйнае будаўніцтва

НА ШЛЯХОХ ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

На аснове бальшавіцкай самакрытыкі, пад лёзунгам непрымірымай барацьбы з правым апартунізмам --галоўнай небясьпекай і з „левымі“ загібамі, пад знакам згуртаваньня навокал ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б праходзяць партыйныя канфэрэнцыі

Даклад тав. ГЕЯ

на 9-ай партканфэрэнцыі Беларускае вайсковае акругі

— Таварышы, дазвольце вітаць вашу канфэрэнцыю ад імя ЦК камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (аплёдысмэнты).

Работа Цэнтральнага Камітэту нашай партыі за справаздачны пэрыяд працякала ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы ўнутры Савецкага Саюзу і ў капіталістычных краінах. Сусьветны крызіс, які пачаўся восеньню мінулага году, ахапіў ПАЗШ і асноўныя капіталістычныя краіны Заходняй Эўропы. Гэты крызіс фарсуе далейшае абвастрэньне клясавай барацьбы, рост рэвалюцыйнага ўздыму рабочае клясы і адначасова набліжае небясьпеку вайны. Савецкі Саюз праводзіць і будзе праводзіць палітыку міру, але вучот рэальнай абстаноўкі паказвае, што сусьветны імпэрыялізм, які заблытаўся ў супярэчнасьцях, будзе шукаць выхаду ў вайне супроць краіны, якая з посьпехам будуе сацыялізм. Аб гэтым таксама сьведчыць тая шалёная антысавецкая кампанія, якую вядуць фашыстыя і сацыял - фашыстыя, клерыкалы ўсіх колераў і іншыя сілы сусьветнай буржуазіі. Міжнародная абстаноўка ставіць перад намі пытаньне аб неабходнасьці быць гатовымі да абароны нашых заваяваньняў, да абароны граніц СССР узброенай рукой. Таму ЦК КП(б)Б цьвёрда і няўхільна праводзіць работу па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны, па аказаньні дапамогі і падтрыманьні Чырвонай арміі.

Далей тав. Гей падрабязна спыняецца на гаспадарчым становішчы БССР. Прамысловасьць БССР разьвіваецца нячувана хуткімі тэмпамі: рост валавой прадукцыі прамысловасьці БССР складае 41 проц. за 1929 г. у адносінах да папярэдняга году, у той час, як РСФСР мае 24 проц., УССР — 15 проц., ЗСФСР —25 проц., ТуркСР — 39 проц., УзбССР 36 проц., а СССР у цэлым — 23 проц. Для ацэнкі гэтых тэмпаў трэба памятаць, што перадавыя капіталістычныя краіны ў лепшыя гады прамысловага ўздыму мелі рост прадукцыі за год ня больш, чым на 8 проц. Першае паўгодзьдзе 1930 г. дае рост прадукцыі на 72 проц. Буйныя дасягненьні мае БССР у капітальным будаўніцтве і электрыфікацыі. Запытаньне — чаму-ж такая трывога за выкананьне прамфінпляну на старонках нашай прэсы і ў рабоце партыйных і грамадзкіх арганізацый. Трэба сказаць, што побач з буйнымі дасягненьнямі, мы маем вялікія недахопы, галоўным чынам, у зьніжэньні сабекошту і якасьці прадукцыі. Зьніжэньне сабекошту адстае ад плянавых заданьняў: у 1928-29 г. яна зьнізілася ўсяго на 4,5 проц. замест вызначаных паводле пляну 7 проц., за першае паўгодзьдзе 1929-30 г. удалося зьнізіць сабекошт на 7 проц., замест 11, намечаных плянам. Якасьць прадукцыі застаецца зусім нездавальняючай.

Тыя посьпехі, якія мы маем у прамысловасьці, у значнай ступені тлумачацца нячуваным вытворчым уздымам рабочае клясы, які знайшоў сваё выяўленьне ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве. Мы ня раз крытыкавалі папярэдзіўшы адносіны да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, узмацнялі сапраўднае жывое кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, вядучы барацьбу з лжэ-ўдарніцтвам і фразэрствам, і ў сучасны момант да 75 проц. рабочых па 160 буйных прадпрыемствах ахоплены сацспаборніцтвам і па 132 прадпрыемствах — 46,5 проц. рабочых зьяўляюцца ўдарнікамі. Гэтыя лічбы даводзяць, што вытворчы ўздым ахапіў самыя глыбінныя пласты рабочае клясы.

Мы з упэўненасьцю можам сказаць, што БССР ідзе хуткімі крокамі па шляху ператварэньня з краіны аграрнай у краіну аграрна - індустрыяльную.

Рост вытворчых сіл сельскае гаспадаркі ідзе больш павольным тэмпам. Хуткае разьвіцьцё сельскае гаспадаркі магчыма толькі пры карэннай яго рэканструкцыі шляхам стварэньня буйных гаспадарак сацыялістычнага тыпу. Наша партыя няўхільна праводзіла і праводзіць палітыку разьвіцьця і падтрыманьня калгаснага руху. Восеньню 1929 г. мы мелі каля 4 проц. пасеўнай плошчы, ахопленай калгасамі. У сучасны момант мы маем каля 18 проц. калектывізаванай пасеўнай плошчы і каля 13 проц. калектывізаваных двароў. Паміж 1-м кастрычніка 1929 г. і сёнешнім днём мы прайшлі той шлях разьвіцьця калектывізацыі, які прывёў нас да «галавакружэньня ад посьпехаў». У канцы лютага мы мелі на паперы звыш 60 проц. калектывізаванай плошчы. У канцы-ж лютага пачаўся адліў з калгасаў. Гэты адліў абумоўліваўся радам памылак і скажэньняў лініі партыі, з якіх найбольш грубымі былі небальшавіцкія адносіны да серадняка, г. зн. прымус пры арганізацыі калгасаў. Можна падаць шмат выпадкаў арыштаў і пагроз у адносінах да сялян, якія не жадалі ўступаць у калгасы. У дырэктывах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б даваліся дакладныя ўказаньні аб тым, што калгасны рух можа і павінен разьвівацца толькі на аснове сапраўднай актыўнасьці батрацка - бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі, г. зн. на аснове поўнай добраахвотнасьці. Далейшыя памылкі былі зроблены ў вызначэньні тэмпу калектывізацыі, у спробах абагуленьня «ўсяго і ўся», у пасьпяховым і неўгрунтаваным пераводзе калгасаў на статут камуны, мінаючы с.-г. арцелі. Апошніх памылак ня ўнікнуў і ЦК КП(б)Б, адкрыта іх прызнаўшы ў сваёй пастанове ад 17-га красавіка, якая была апублікавана. Скажэньні лініі партыі на мясцох насілі «левы» характар, аднак, гэтыя «левыя» загібы маюць агульныя крыніцы з правым ухілам. Яны таксама, як і правы ўхіл, зьяўляюцца вынікам узьдзейнічаньня на нашу партыю дробна - буржуазнага асяродзішча, яны харчуюць і ўзмацняюць адкрыта правапартуністычныя тэндэнцыі і зьяўляюцца адзэй з рознавіднасьцяй апартунізму. ЦК УсеКП(б) у сваіх апошніх дырэктывах і артыкулах тав. Сталіна ўдарыў па «левых» загібах і мабілізаваў партыйныя арганізацыі на барацьбу за бальшавіцкае выпраўленьне памылак і скажэньняў лініі партыі ў калгасным будаўніцтве. Аднак, ня ўсе партыйныя арганізацыі аднолькава хутка ўсьвядомілі ўказаньні ЦК УсеКП(б). Мы маем выпадкі яўнага і скрытага супраціўленьня безадкладнаму выпраўленьню скажэньняў. Мы білі і будзем біць з усёй рашучасьцю па тых, хто супраціўляўся правядзеньню лініі партыі, ня спыняючыся перад роспускам асобных парторганаў (Шклоў і інш.). Таксама рашуча змагаецца ЦК КП(б)Б супроць панікёраў, якія апускаюць рукі і крычаць аб тым, што «ўсё прапала». Наша задача ў калгасным будаўніцтве — усямерна гаспадарча ўзмацняць існуючыя калгасы, у якіх пасьля адсеву нямоцнага і выпадковага засталіся сапраўды здаровыя элемэнты.

Посьпехі прамысловасьці і рост калгаснага руху абумовіў пераход ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элемэнтаў вёскі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Перагібы і скажэньні мы мелі і пры раскулачваньні.

Пераходзячы да наступных пытаньняў свайго дакладу, тав. Гей гаворыць, што рост актыўнасьці рабочае клясы адбіўся ня толькі ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, але і ва ўзмоцненым прыцёку рабочых ад варштату ў рады партыі. У выніку — процант рабочых ад варштату ўзрос з 40 проц. на 1-га студзеня 1929 г. да 45 проц. на 1-га студзеня 1930 г. Няма чаго сумнявацца, што мы выказваем задачу—давесьці да зьезду партыі пік рабочых ад варштату да 50 проц. Другім паказальнікам росту актыўнасьці рабочых зьяўляецца шырокае разгортваньне самакрытыкі. ЦК КП(б)Б прыходзілася няўхільна змагацца з радам выпадкаў заціску самакрытыкі, прасьледваньня рабкораў і г. д. Адным з апошніх найбольш характэрных спраў гэтага роду была гомельская справа, дзе акруговае партклёраўніцтва дапусьціла рад апартуністычных памылак, падтрымаўшы зажымшчыкаў самакрытыкі. ЦК КП(б)Б правёў радыкальнае абнаўленьне кіраўніцтва Гомельскай арганізацыі. Нам трэба памятаць, што без сапраўды шырокага разьвіцьця самакрытыкі, без уцягненьня шырокіх беспартыйных мас рабочых, партыя ня зможа справіцца з задачамі будаўніцтва сацыялізму.

Рашаючым момантам, які забясьпечыў партыі шырокае падтрыманьне рабочае клясы, было пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі. Партыя ідэйна ўмацавалася і вырасла ў барацьбе з правым ухілам, які замазваў клясавую барацьбу, цягнуў партыю назад. Найбольш выразнае выяўленьне правага ўхілу ў БССР зьвязваецца з імем Прышчэпава. Ён, будучы наркамзэмам БССР, займаўся насаджэньнем хутароў, выступаў супроць калектывізацыі, сабатаваў дырэктывы партыі, утойваў ад партыі даныя ім указаньні, якія разыходзяцца з лініяй партыі ў вёсцы. Асабліваецці правага ўхілу ў БССР заключаюцца ў тым, што праваўхілісцкая ўстаноўка ў агульна-партыйных пытаньнях цесна зьвязана з нацыянал-апартуністычнымі і нацыянал-дэмакратычнымі ўхіламі, якія жывяцца інтэлігенцкімі і літаратурнымі коламі. Ад Прышчэпава цягнуцца ніці да Зарэцкага, які падаў у «Падарожжы на новую зямлю» паклёпніцкую характарыстыку становішча ў БССР.

Спыняючыся далей на розных праяўленьнях нацыянал - дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў, асабліва вялікадзяржаўнага, і падрабязна выкладаючы пасьпяховую барацьбу партыі супроць усіх ухілаў ад ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні, т. Гей характарызуе посьпехі культурнага будаўніцтва БССР. Адным з буйнейшых зававаньняў у гэтай галіне зьявілася ўвядзеньне ўсеагульнага пачатковага навучаньня дзяцей ва ўзросьце ад 8 да 11 год. Мы адкрылі 1.500 новых школ з абавязковым навучаньнем да 90 проц. усіх дзяцей.

Агульныя вынікі работы партыі за пэрыяд паміж 12-м і 13-м партзьездамі зводзяцца да таго, што ў галіне прамысловасьці мы поўнасьцю ажыцьцяўляем лёзунгі «Пяцігодка за чатыры гады»; у галіне сельскае гаспадаркі бальшавіцкае выпраўленьне перагібаў і скажэньняў у калгасным будаўніцтве садзейнічае ўзмацненьню існуючых калгасаў і далейшаму іх росту. Партыя з посьпехам праводзіць сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

Будуць, вядома, і труднасьці, галоўным чынам, у справе пасьпяховага завяршэньня веснавое сяўбы, у задаваленьні харчовым забесьпячэньнем гарадоў і г. д.

ПАРТЫЯ ПЕРАМОЖА ГЭТЫЯ ТРУДНАСЬЦІ, НЯЎХІЛЬНА ПРАВОДЗЯЧЫ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАД ВЫПРАВАВАНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б), ДАЮЧЫ БЯЗЛІТАСНЫ АДПОР ПРАВЫМ УХІЛІСТЫМ І «ЛЕВЫМ» ЗАГІБШЧЫКАМ, І ПОЙДЗЕ ЎПЕРАД ДА НОВЫХ ПОСЬПЕХАЎ, ДА НОВЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ У СПРАВЕ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ.

На 3-й Кастрычніцкай раённай партканфэрэнцыі

На ўчарайшым пасяджэньні Кастрычніцкай раённай партканфэрэнцыі т. **Гантман** скончыў даклад аб рабоце ЦК КП(б)Б.

Пасьля дакладу т. Гантмана канфэрэнцыю вітала дэлегацыя раённага атраду Асоавіяхіму.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму **ЦК УсеКП(б) і т. Сталіну, ЦК КП(б)Б і Мен. АК КП(б)Б, Рэвваенсавету і т. Варашылаву, ЦК кампартыі Польшчы і Зах. Беларусі, Ц. О. УсеКП(б) «Правде» і КП(б)Б—«Зьвязьдзе».**

Па дакладу т. Гантмана разгарнуліся шырокія спрэчкі. Выказаліся наступныя таварышы: **Круглікаў, Кушэнэраў, Палякоўскі Вэйнэровіч, Уласаў, Шульман, Анорын, Вішнеўская і Бягун.**

Сёньня працягваюцца спрэчкі па дакладу т. Гантмана.

На хаду перавыбараў

Гомель

Нядаўна закончылася VI партыйная канфэрэнцыя Рэчыцкага раёну. Канфэрэнцыя падагуліла рэзультаты 7-мясячнай работы і вызначыла далейшыя задачы і шляхі работы раённай партарганізацыі.

Шырока разгарнуўшы самакрытыку, раённая канфэрэнцыя выкрыла дапушчаныя недахопы і памылкі ў барацьбе за прамфінплян і ў калгасным будаўніцтве. Канстатаваўшы пэўныя посьпехі ў выкананьні прамфінпляну (завод імя **Томскага** перавыканаў прамфінплян), канфэрэнцыя разам з гэтым рашуча падкрэсьліла, што многія вытворчыя парткалектывы яшчэ ня сталі арганізатарамі барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну (фабрыка **«Дняпро»**, завод **«Інтэрнацыянал»**, фабрыка **«Х Кастрычнік»**).

Вялікую ўвагу канфэрэнцыя зьвярнула на пытаньні калгаснага будаўніцтва ў раёне. З усёй рашучасьцю канфэрэнцыя асудзіла дапушчаныя ў Рэчыцкім раёне антысярадняцкія перагібы і грубыя скрыўленьні. Канфэрэнцыя абавязала ўсіх камуністых забясьпечыць хутчэйшае выпраўленьне перагібаў і памылак, меўшых месца ў раёне.

Канфэрэнцыя адзначыла патрэбнасьць максымальна ўзмацніць тэмп росту раённай партарганізацыі за лік перадавых рабочых ад варштату і лепшых калгасьнікаў — батракоў і беднякоў.

***

XI Добруская раённая партканфэрэнцыя паслала прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б. Вітаючы ЦК КП(б)Б, раённая партканфэрэнцыя запэўніла Цэнтральны Камітэт, што абяцаньне выпусьціць звыш пляну 2.300 тон паперы будзе выканана.

***

23-я партыйная канфэрэнцыя гарадзкой арганізацыі пастанавіла перайменаваць гарадзкі райком КП(б)Б у **Дзяржынскі** райком партыі. Першы пленум Дзяржынскага РК КП(б)Б выбраў сакратаром райкому т. **Мазура.**

Бабруйск

Адкрылася XII партыйная канфэрэнцыя **Жлобінскага** раёну. Канфэрэнцыя абмяркуе даклад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і справаздачу раённага камітэту. Перад пачаткам сваёй работы канфэрэнцыя заслухала прывітаньні прадстаўнікоў прафсаюзных арганізацый і калгасаў.

З вялікай увагай канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **Сянкевіча** аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. Канфэрэнцыя прызнала палітычную лінію Цэнтральнага Камітэту выразнай і правільнай.

Пры абмеркаваньні справаздачы РК КП(б)Б дэлегаты канфэрэнцыі рашуча завастрылі ўвагу на прызнаньні і выпраўленьні памылак, дапушчаных у калгасным будаўніцтве. Т. т., якія выступалі ў спрэчках, адзначалі, што партыйная арганізацыя слаба праводзіць работу сярод батрацка-бядняцкіх мас, невыстарчальна кіруе камсамолам і г. д.

Віцебск

Перавыбары бюро ячэйкі фабрыкі імя Ленерта прайшлі пры актыўным удзеле камуністых і беспартыйных рабочых. На справаздачна - перавыбарчым сходзе прысутнічала каля 300 чалавек. Перавыбары паказалі, што ў ячэйцы маюць месца сур'ёзныя прарывы.

Слаба разгорнута барацьба за выкананьне якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну.

Як самы сур'ёзны і недапушчальны прарыў у рабоце бюро, сход ячэйкі адзначыў слабую сувязь з рабочымі-25-тысячнікамі. Бюро не кіравала таварышамі, пасланымі ў калгасы ў лік «25.000» і зусім не дапамагала ім. Новаму бюро прапанавана ўзмацніць партыйную работу па ўсіх пытаньнях і рашуча выправіць недахопы, якія мелі месца ў ячэйцы.

***

Закончылася XII канфэрэнцыя 2-й раённай гарадзкой арганізацыі. Прызнаўшы палітычную лінію раённага камітэту правільнай, канфэрэнцыя разам з гэтым адзначыла рад сур'ёзных недахопаў як у рабоце РК, так і ўсёй партарганізацыі.

У новы склад раённага камітэту выбрана 40 членаў і кандыдатаў. Першы пленум новага РК выбраў сакратаром раённага камітэту тав. **Батву.**

Ворша

Горацкая раённая партканфэрэнцыя, якая скончылася гэтымі днямі, абмеркавала даклад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, даклад Аршанскага АК і справаздачу раённага камітэту партыі.

Канфэрэнцыя рашуча падкрэсьліла, што ў Горацкім раёне ў калгасным будаўніцтве мелі месца грубыя перагібы і палітычныя памылкі. Канфэрэнцыя асудзіла факты адміністраваньня і націску, якія практыкаваліся радам мясцовых работнікаў пры арганізацыі калгасаў. Канфэрэнцыя адзначыла палітычную памылку раённага камітэту, які, ня маючы ніякіх падстаў і не правёўшы ніякай падрыхтоўкі, абвясьціў Горацкі раён раёнам суцэльнай калектывізацыі.

Раённая канфэрэнцыя рашуча асудзіла спробы асобных партыйцаў замазаць-дапушчаныя імі перагібы і скрыўленьні партыйнай лініі. У часе работы канфэрэнцыі калгасы рапартавалі аб прыліве новых членаў, аб выкананьні засеву яравога кліну, абяцаючы партыйнай канфэрэнцыі ў тэрмін скончыць веснавую сяўбу.

***

Перавыбары бюро **Ляднянскай** партячэйкі паказалі, што кіраўніцтва ячэйкі працавала зусім дрэнна. Сход адзначыў, што пры правядзеньні калектывізацыі асобныя партыйцы скажалі лінію партыі, перасоквалі праз арцель да камуны, скрыўлялі партыйныя дырэктывы пры абагуленьні насеньня і сі[illegible]ны і г. д.

Нельга не адзначыць, што саг[illegible] ячэйкі, які нясе непасрэдную [illegible] пасьць за ўсе гэтыя скажэньні і [illegible] сам асабіста скрыўляў партыйную [illegible]нію, упарта не прызнае сваіх п[illegible]. Замест прызнаньня дапушчаных [illegible]лак, сакратар ячэйкі заявіў, што [illegible] лектывізацыя нам перашкаджала [illegible] боце». Раённы камітэт павінен зрабі[illegible] з гэтага факту адпаведныя вывады.

***

Адбыліся перавыбары **Смалянск**[illegible] парт'ячэйкі. У перавыбарчым сх[illegible] прынялі актыўны ўдзел беспартыйн[illegible] калгасьнікі. У новы склад бюро выб[illegible] на 5 членаў і кандыдатаў.

***

Багушэўская раённая партканфэр[illegible]цыя прайшла пад знакам выпраўле[illegible]ня дапушчаных памылак у калгасн[illegible] будаўніцтве. Канфэрэнцыя рашуча [illegible]дзіла меўшыя месца ў раёне факты [illegible]міністраваньня і пераскованьня п[illegible] арцель да камуны. Канфэрэнцыя зьв[illegible]нулася з прывітаньнем да Цэнтральн[illegible] Камітэту КП(б)Б, у якім запэўнае [illegible] што Багушэўская раённая арганізац[illegible] хутка і рашуча выпраўіўшы перагі[illegible] разгорне калгаснае будаўніцтва [illegible] аснове дырэктыў партыі і даб'е[illegible] сваячасовага сканчэньня веснавой с[illegible]бы.

Фрунзаўская партканфэрэнцыя

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ ТАВ. ШПЭКТАРАВА

Пасьля справаздачы тав. **Шпэктарава** канфэрэнцыя заслухала даклад раённага камітэту ЛКСМБ.

Дакладчык тав. **Райхэльсон** адзначыў, што Фрунзаўскі камсамол нерабудоўвае сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі барацьбы за бальшавіцкую партыйную лінію. — У нас былі, сказаў дакладчык, выпадкі праваапартуністычных выступленьняў з боку асобных камсамольцаў. Напрыклад, у ячэйцы **Нарсувязі** мы мелі выступленьне супроць калектывізацыі. У такіх выпадках камсамольскія ячэйкі не заўсёды праяўлялі патрэбную рашучасьць. Раённы камітэт і бюро ячэек КП(б)Б своячасова далі жорсткі адпор гэтым выступленьням.

На гэту канфэрэнцыю мы прыйшлі з вялікім палітычным багажом. На радзе прадпрыемстваў камсамольцы зьявіліся ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху (друкарня імя **Сталіна, ф-ка «Кастрычнік», з-д «Камунар»).**

За сваю работу па ўдзеле ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну Фрунзаўскі камсамол атрымаў ад ВСНГ чырвоны сьцяг. Мы гэты сьцяг перадалі аднаму з лепшых камсамольскіх калектываў, які паказаў узорную работу па правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва, — калектыву заводу **«Камунар».**

Аднак, ёсьць яшчэ асобныя калектывы, якія працуюць зусім дрэнна (фабрыка **«Беларуска»).** Дакладчык падкрэсьліў, што за апошні час мае месца масавы прыліў рабочай моладзі ў рады камсамольскай арганізацыі.

На апошняй канфэрэнцыі моладзі мы атрымалі звыш 200 заяў аб уступленьні ў камсамол.

Потым тав. Райхэльсон спыніўся па пытаньнях парткіраўніцтва камсамольскімі ячэйкамі. Дакладчык падкрэсьліў, што рад партыйных ячэек зусім невыстарчальна кіруе камсамольскімі ячэйкамі. Гэтым тлумачацца буйныя прарывы ў рабоце асобных камсамольскіх ячэек.

Канфэрэнцыя заслухала справаздачны даклад парттройкі, з якім выступіў тав. **Патоцкі.** Дакладчык сказаў, што парттройка за справаздачны пэрыяд разгледзела 40 спраў. Пастановамі парттройкі 15 чал. выключаны з партыі.

Перад адкрыцьцем спрэчак па дакладах РК КП(б)Б, РК КСМ і партыйнай тройкі, канфэрэнцыя пастанавіла запрасіць тав. **Уншліхта** на канфэрэнцыю і абрала яго ў прэзыдыум.

Першым у спрэчках па дакладу РК КП(б)Б выступіў тав. **Нісэнбаум.** Ён гаварыў аб рабоце партыйнай ячэйкі Менскага хлебазаводу. Раней на хлебазаводзе, сказаў прамоўца, прыработак дасягаў 80 проц. Калі завод абвясьціў сябе ўдарным, мы паставілі пытаньне аб павялічэньні норм выпрацоўкі. Рабочая маса пайшла за партыйнай ячэйкай і нормы былі павялічаны. Аднак, нельга сказаць, што на заводзе ўсё добра. Ёсьць выпадкі паломкі машын. На гэта трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

Тав. **Місура** спыніўся на пытаньнях адзінаначальля. Ён падаў факты, калі асобныя дырэктары (Эльвод) парушаюць прынцыпы адзінаначальля. — З такімі парушэньнямі, заявіў тав. Місура, трэба змагацца.

Тав. **Раманцоў** гаварыў аб барацьбе з бюракратызмам і скрыўленьнямі клясавай лініі ў рабоце асобных устаноў. Раённы камітэт павінен узмацніць сваю ўвагу да савецкіх яэек, павінен сыстэматычна правяраць наколькі савецкія ячэйкі вядуць барацьбу з бюракратызмам і цяганінай. Потым тав. Раманц[illegible] заявіў, што раённы камітэт павінен [illegible] бясьпечыць узмацненьне работы [illegible] шэфстве заводаў і фабрык над савец[illegible] апаратам.

Тав. **Шахновіч** у сваім выступлен[illegible] спыніўся на пытаньнях работы сяр[illegible] жанчын. — Не сакрэт, заявіў прамоў[illegible] што гэта работа паслабла. Асобныя [illegible]варышы думаюць, што калі няма ж[illegible] аддзелаў, дык значыць на работу [illegible] род жанчын трэба зварачаць мен[illegible] увагі. Наша задача—рашуча ўдары[illegible] па такіх настроях. Мы павінны дабіц[illegible] карэннага пералому ў рабоце сяр[illegible] жанчын.

— На вялікі жал, гаворыць тав. **Пл[illegible]тун**, прыходзіцца канстатаваць, што [illegible] дакладзе РК КП(б)Б амаль нічога [illegible] было сказана аб культурнай рабо[illegible] Між тым, культурнае будаўніцтва, па[illegible]рыхтоўка кадраў зьяўляюцца аднымі [illegible] самых асноўных пытаньняў.

— Тыя прарывы, сказаў далей т. Пл[illegible]тун, якія мы мелі ў Наркамасьвеце і [illegible] нашым культурным будаўніцтве, по[illegible]насьцю яшчэ не ліквідаваны. Таму м[illegible] павінны рашуча ўзмацніць сваю ра[illegible]ту па культурным будаўніцтве, безаг[illegible]кладна выправіць усе недахопы і хібы.

Паводле пастановы Цэнтральнага К[illegible]мітэту партыі, 1.300 камуністых і ка[illegible] самольцаў пасылаюцца ў ВНУ, ВТН [illegible] і тэхнікумы. Але ўсе хочуць быць і[illegible] жынэрамі і на іншыя факультэты к[illegible] тэгарычна адмаўляюцца ісьці. Гэт[illegible] зьяўляецца няправільным.

Тав. **Камко** гаварыў аб рабоце сяро[illegible] сэзонькінаў. Ён адзначыў, што гэта р[illegible]бота праводзіцца не здавальняюча. — Нам трэба, сказаў тав. Камко, шырок[illegible] растлумачыць сярод сэзонькінаў пал[illegible]тыку партыі на вёсцы.

У спрэчках таксама выступіў сакр[illegible]тар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б та[illegible] **Гей** і рад іншых таварышоў.

***

Канфэрэнцыю віталі дэлегацыя ад р[illegible]бочых **Белдзяржбуду** і ад рабочых і[illegible] жынэраў **Эльводу.** З адказам на прыв[illegible]таньні выступіў тав. **Якаўлеў.**

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ І УПОЎНАВАЖАНЫЯ!

У другой палове мая адкрываецца

13 ЗЬЕЗД КП(б)Б.

Работа зьезду будзе асьвятляцца поўнасьцю на старонках **„ЗЬВЯЗДЫ“.**

Каб даць магчымасьць атрымліваць у маі месяцы газ. **„ЗЬВЯЗДА“** тым падпісчыкам, якія не пасьпелі падпісацца з 1 мая,

АДКРЫТА ПАДПІСКА на „ЗЬВЯЗДУ“ з 16 МАЯ (поўмесячная) і далейшыя тэрміны.

Аб падручніках для масавай школы

Пытаньню аб падручніку для масавай школы да гэтага часу нашай грамадзкасьцю не аддавалася тае ўвагі, якое яно заслугоўвае. А між тым значэньне гэтага падручніка вялізарнае і таму яму павінна быць аддана самая сур'ёзная ўвага. Ужо ў бягучым годзе каля 90 проц. дзяцей 8-гадовага ўзросту ахоплена ў Беларусі школай. У будучым годзе ўводзіцца абавязковае навучаньне і для дзяцей 9-11-гадовага ўзросту. Словам, усе дзеці, або амаль усе дзеці ад 8—11 год і з кожным годам усё больш значная частка дзяцей 11—15 год — паллягае нашаму ўплыву праз школу і, значыцца, праз падручнікі, па якіх яны навучаюцца. Роля падручніка не абмяжоўваецца яго ўплывам на школьніка; ён мае вялізарны ўплыў і на дарослае насельніцтва. Не гаворачы ўжо аб тым, што тыя веды, якія атрымлівае дзіця, і тыя погляды, якія выпрацоўваюцца ў яго, аказваюць уплыў на старэйшых членаў сям'і.

Хіба ня бывае ў нас часта, асабліва ў вёсцы, што падручнік, па якім навучаецца дзіця, гэта наогул адзіная кніга, якая ёсьць у сям'і.

Такія ўмовы патрабуюць асаблівай уважлівасьці, стараннасьці пры складаньні падручнікаў для нашай школы. Становішча з падручнікамі здавальняючым і да гэтага часу прызнаць нельга.

Не гаворачы ўжо аб тым, што мы часта адчуваем вялікую нястачу падручнікаў, што яны звычайна спазняюцца, — тыя падручнікі, якія мы маем, нас задаволіць ня могуць.

І галоўнай бядой звычайна зьяўляецца адарванасьць падручніка ад сучаснасьці, адарванасьць ад актуальнейшых задач, што стаяць перад нашай краінай.

Задача нашага падручніка не заключаецца толькі ў тым, каб даць тыя ці іншыя веды, каб навучыць дзіця чытаць, лічыць і г. д. Вязумоўна, і гэта задача мае вялізарнае значэньне, і калі падручнік не дае ведаў, калі ён не дапамагае дзецям навучыцца лічыць, пісаць, разумець карту і г. д., — ён нікуды ня варты, якія-б іншыя якасьці гэты падручнік ня меў.

Але аднаго гэтага мала. Мы патрабуем ад нашай школы, а, значыцца, і ад падручніка, каб яна выхавала з дзіцяці будаўніка сацыялістычнага грамадзтва, г. зн. каб яна дапамагла клясаваму, інтэрнацыянальнаму, калектывістычнаму, антырэлігійнаму выхаваньню дзіцяці, каб яна давала яму веды, неабходныя для актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізму.

Дасюль, ня гледзячы на значны крок уперад, зроблены нашай школай за апошні час, мы выконваем гэту задачу яшчэ дрэнна і значная доля віны за гэта ляжыць на нашым падручніку.

Мы ўжо ня будзем гаварыць аб тым, што ў нашых падручніках мы сустракаемся з праявамі шкоднай нам ідэалёгіі, з праявамі нацыяналізму, усхваленьнем «роднай старонкі», затушоўваньнем клясавай барацьбы, усхваленьнем кулацкіх гаспадарак, як культурных гаспадарак, усхваленьнем кірмашу, дзе кулакі і гандляры абіраюць сілян, як прыладу змычкі пралетарыяту з сялянствам, з рэлігійнымі настроямі і г. д., і г. д.

Але калі і не гаварыць аб гэтых і падобных фактах, якіх у нашай прэсе ўжо прыводзілася нямала, фактах, у якіх проста праяўляецца спроба навязаць дзецям погляды, варожыя пралетарыяту, агульнай бядой нашых падручнікаў зьяўлялася тое, што асноўныя задачы, што стаяць перад школай у справе грамадзкае - палітычнага выхаваньня дзіцяці, асноўныя задачы, што стаяць перад краінай, у іх знаходзілі вельмі недастатковае асьвятленьне. **Нашы падручнікі адстаюць ад жыцьця і адстаюць на вялікія тэрміны.** Гэта часткова тлумачыцца тым, што мы жывем у вельмі бурны час, што ідзем уперад нябачанымі ў сьвеце тэмпамі, што перад намі высоўваюцца ўсё новыя і новыя задачы.

Нямала нашых падручнікаў у самы момант іх **напісаньня** зьяўляліся нездавальняючымі, яны не адказвалі задачам, ужо тады стаяўшым перад школай. Напрыклад, пытаньне аб антырэлігійным выхаваньні, пытаньне, якое ні сёньня і ні ўчора пастаўлена нашай партыяй. А між тым, вазьмеце нашы падручнікі, нават па дысцыплінах, якія даюць добры матар'ял для антырэлігійнага выхаваньня (грамадазнаўства, прыродазнаўства, фізыка і г. д.), і вы ўбачыце, што там гэты матар'ял ня выкарыстаны, і падручнік нічога, або амаль нічога не дае для антырэлігійнага выхаваньня.

Або працэсы індустрыялізацыі краіны, якія маюць вялізарнейшае значэньне і выклікаюць у дзяцей значную цікавасьць, — не адбіты нават у падручніках, напісаных тады, калі працэсы індустрыялізацыі ўжо разьвіваліся бурнымі тэмпамі. Такіх прыкладаў можна было-б прывесьці дзесяткі, і тлумачацца яны, не ў апошнюю чаргу, тым, што да гэтых часоў яшчэ многія аўтары знаходзяцца пад уплывам старой школы, у якой яны выхоўваліся і ў якой многія з іх працавалі. Яны не зразумелі, што ў адрозьненьне ад старой дарэвалюцыйнай школы, задачай якой было адвесьці дзіця па магчымасьці далей ад сучаснасьці, — наша школа ня толькі ў гэтым не зацікаўлена, яна кроўна зацікаўлена ў адваротным. Бо ў адрозьненьне ад панаваўшых раней клясаў, якія, бачачы рэвалюцыйныя сілы, што з кожным днём падрывалі іх панаваньне, баяліся сёньняшняга дня і яшчэ больш баяліся заўтрашняга дня, якія глядзелі ня ў будучае, што рыхтавала ім пагібель, а ў мінулае, — пралетарыят ня мае ніякіх падстаў баяцца сёньняшняга і заўтрашняга дня, бо кожны дзень набліжае яго да канчатковай перамогі.

Апрача неразуменьня прынцыповага адрозьненьня новай школы ад старой яшчэ большую ролю адыгрывае той сумны факт, што нашы выкладчыкі, якія зьяўляюцца і аўтарамі падручнікаў, самі ў палітычных адносінах часта бываюць слаба падрыхтаванымі і таму лепшыя нават намеры з іх боку часта не даюць патрэбных рэзультатаў.

Гэтым, а таксама новымі задачамі, што сталі перад школай, тлумачыцца той факт, што мы да гэтага часу ня маем здавальняючага нас падручніка, гэтым тлумачыцца, што ў бягучым годзе Наркамасьветы павінен быў паставіць перад сабою задачу панава скласьці амаль усе падручнікі для масавай школы. Гэта вялізарнейшая работа зараз прыбліжаецца да канца, яна прайшла пад лёзунгамі: «бліжэй да сучаснасьці», «за індустрыялізацыю і калектывізацыю», «за клясавае, інтэрнацыянальнае, антырэлігійнае выхаваньне».

Аднак, і новыя падручнікі паўрад ці змогуць поўнасьцю нас задаволіць, і ў іх яшчэ будзе, калі не даваць ужо аб асобных памылках і ляпсусах, цэлы рад буйных недахопаў.

Важнейшым з іх, з нашага пункту погляду, зьяўляецца тое, што ў нас у падручніках вельмі шмат агульнай агітацыі, вельмі мала канкрэтнага паказу, мала фактаў, што яны даюць мала ведаў з галіны тэхнікі, аграноміі і г. д., ведаў, якія нам дазарэзу патрэбны.

«Падручнік павінен даваць, перш за ўсё, каштоўны **фактычны матар'ял,** які трэба ўсвоіць. Падручнік перш за ўсё— справачнік, дапаможнік для запамінаньня. Матар'

РАШУЧЫ АДПОР СПРОБАМ КУЛАКА САРВАЦЬ СЯЎБУ

Папулярызаваць ільготы за пашырэньне плошчы пасеваў

Бязьлітасная барацьба з прымірэнчымі адносінамі да кулака і недаацэнкай работы з беднатой,—гэтымі яскравымі праявамі правага ўхілу

Бязьдзейнасьць і прымірэнчыя адносіны да кулака

Віцебскі раён зьяўляецца раёнам разьвіцьця жывёлагадоўлі і травасеяньня. Значны процант плошчы займае лён і іншыя тэхнічныя культуры. У сельсаветах вакол гораду разьвіта гароднінтва. У часы харчовых труднасьцяй кулакі нажываліся, спэкулюючы малаком, раньняй бульбай, гароднінай.

Калектывізацыя, якая разгарнулася ў акрузе, ліквідацыя кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі, выклікала шалёнае супраціўленьне кулацтва. Кулак разгарнуў моцную агітацыю за зрыў калектывізацыі і веснавой сяўбы. Але клясавы вораг ня змог спыніць калгасны рух на вёсцы.

Калгасы зараз пачынаюць эканамічна ўзмацняцца і расьці. У радзе калгасаў раёну насяляецца прыліў. На палёх калгасаў ужо разгарнулася масавая сяўба.

Індывідуальны сэктар, аднак, адстае ў галіне разгортваньня веснавой сяўбы. Адзай з прычын гэтага зьяўляецца бязьдзейнасьць і няўважлівыя адносіны арганізацый да забесьпячэньня выкананьня пляну індывідуальным сэктарам. Бясспрэчна, аднак, што моцны ўплыў робіць агітацыя кулака. Ён зараз разгарнуў антысавецкую дзейнасьць сярод індывідуальных бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак з мэтай сарваць план пашырэньня яравога кліну, агрэгінімуму і кантрактацыі.

Кулакі кажуць:

«Не пашырайце плошчы, бо вас раскулачаць. Закон аб пашырэньні плошчы і вызваленьні ад падатку за пашыраныя плошчы, гэта толькі ашуканства. Не кантрактуйце, бо гэтым будзеце прымушаны зноў пайсьці ў калгасы. Адчаўляйцеся ад зямель, якія вам далі за межамі калгасаў. Тэхнічных культур ня сейце. Замяняйце і сейце лепш авёс, бульбу, ячмень».

Такія кулацкія паклёпы на савецкую ўладу, такія ні на чым не ўгрунтаваныя гутаркі, на жаль, не сустракаюць належнага адпору в боку мясцовых работнікаў. Ільготы індывідуальнікам па с.-г. падатку за пашыраньні плошчы пад тэхнічныя культуры не папулярызуюцца. Не разгортваецца, як належыць, і работа з беднатой.

Бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый у галіне папулярызацыі мерапрыемстваў партыі і ўраду, прымірэнчыя адносіны да кулака з боку пасобных працаўнікоў у радзе месц вядуць да зрыву некаторых мерапрыемстваў. Вось факты:

На разьвіцьцё травасеяньня індывідуальнаму сэктару раёну адпускаецца 72.000 руб. крэдытаў, скарыстана-ж... 164 р.

З 5.000 руб. крэдытаў на збожжавыя культуры скарыстана 60 руб., з 2.900 руб. крэдытаў на ільнасемя скарыстана 89 руб.

Сяўба гароднінны ўжо разгарнулася, а крэдытаў скарыстана толькі 18.000 руб. з 24.000 руб., якія ёсьць на гэтую мэту.

У калгасах закантрактавана 2.237,23 гэкт. яравых, у індывідуальным сэктары... — 645 гэкт.

КСУ нічога ня робіць у галіне арганізацыі грамадзкага ворыва, апрацоўкі пустуючых зямель.

Віцебскія раённыя арганізацыі павінны, урэшце, зьвярнуць належную ўвагу на сяўбу ў індывідуальным сэктары. Трэба пакласьці канец праваапартуністычнай недаацэнцы работы сярод беднаты. Трэба даць рашучы адпор прымірэнчым адносінам да кулака.

Брыгадзір «Зьвязды» ВІН.

Недаацэнка працы з беднякамі-індывідуальнікамі

ТАЛАЧЫН, Аршаншчына.

Індывідуальны сэктар у Талачынскім раёне складае 90 проц. Пры зямляўпарадкаваньні калгасаў былі груба парушаны дырэктывы партыі і ўлады аб надзяленьні зямлёй бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ня ўступіўшых у калгасы. Так, у радзе месц былі забраны пад калгас агароды некалгаснікаў, зьменшаны нормы зямлякарыстаньня, ня даны выганы, прагоны і адведзена зусім нягодная зямля.

Перагібы ў зямляўпарадкаваньні выпраўляліся вельмі павольна і толькі тады, калі хадакі тэй ці іншай вёскі прывозілі з Наркамзему адносіны ўрэгуляваць пытаньне.

Плян веснавой сяўбы да двара не даведзен, пашырэньне пасеўнай плошчы—пад пагрозай. Ёсьць апаскі, што былая кулацкая зямля ў Славеньскім і Азарыцкім сельсавеце застанецца не засеянай. Калгасы там разваліліся, камітэты ўзаемадапамогі бязьдзейнічаюць.

Забесьпячэньне бядняцкіх гаспадарак насеньнем і абмен на гатунковае насеньне пастаўлены занадта дрэнна.

Кулатцвам вядзецца шалёная агітацыя за скарачэньне сяўбы, за зрыў сяўбы. Гэтай агітацыі не даецца належнага адпору. З беднатой, якая знаходзіцца па-за калгасам, праца не вядзецца. У некаторых партыйцаў ёсьць неразуменьне значэньня працы з беднатой. На райпартсходзе задаюць, напрыклад, такое пытаньне: «На якую беднату мы павінны апірацца—на тую, што ў калгасе, ці на тую, што па-за калгасам». Штодзённага кіраўніцтва і праверкі ходу сяўбы ў раёне няма. Гэтыя прарывы павінны быць хутка ліквідаваны. Трэба дабіцца пералому ў працы сярод беднаты.

Брыгадзір «Зьвязды» МІНОВІЧ.

Калгас імя Сталіна дапамагае маламоцным гаспадаркам

ВІЦЕБСК.

Калгас імя Сталіна (Машканы)—самы буйны ў Віцебскім раёне. Ямлі ў калгасе—1.530 гэкт., у тым ліку пахаці 1.026 гэкт. У калгасе 203 гаспадаркі (25 проц. сераднякоў і 75 проц. беднякоў і батракоў). Дружная работа калгаснікаў выклікае прыліў калгас новых бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. За апошнія два тыдні калгас уступілі 30 новых серадняцкіх і бядняцкіх гаспадарак. Уступаюць сераднякі, якія маюць па 2-3 каровы. Гэты прыліў у значнай ступені тлумачыцца тым, што ў калгасе існуюць правільныя адносіны да сераднякоў, пошніх вылучаюць на адказную работу і выкарыстоўваюць гаспадарчы вопыт серадняка.

На полі працуе 7 рабочых калён. Калёны разьбіваюцца на брыгады (араных, баранавальнічыкаў, пасеўшчыкаў). За 10 дзён з 20 красавіка па 1 мая было заарана 400 гэкт. і забаранавана—170 гэкт. Прадукцыйнасьць працы вышэйшая, чым у індывідуальных гаспадарках.

З боку праўленьня калгасу і партячэйкі нічога ня было зроблена для разгортваньня сярод калгаснікаў сацспаборніцтва. Але на полі, у працэсе работы, гэтае спаборніцтва ўзьнікла стыхійна паміж брыгадзірамі. Так, па Бельскім пункце рабочая калёна скончыла ворыва і баранаваньне і выклікала па спаборніцтва рэшту рабочых калён.

Калгас аказаў дапамогу 8 індывідуальным бядняцкім гаспадаркам—коньмі, плугамі, насеньнем, а таксама і працай.

Праўленьне калгасу адкладвае, аднак, да сканчэньня веснавой сяўбы такое важнае пытаньне, як устанаўленьне норм аплаты. Праўленьне ў гэтай галіне праяўляе яўную і недапушчальную блізарукасьць. Быў ужо выпадак, калі на грунце непарамальнай аплаты працы група калгаснікаў—кваліфікаваных будаўнікоў—хацела выйсьці з калгасу.

У пачатку палявых работ калгас за свае грошы закупіў [illegible] раз ня мае сродкаў для выдачы авансаў батраком і некаторым бедняком. РВК рэкамэндуе праўленьню калгасу выбракаваць жывёлу, прадаць яе і з атрыманых грошай авансаваць батракоў. РВК, такім чынам, паказвае калгасу няправільны шлях. Для адшуканьня грашовых крыніц трэба было-б пашырыць тыя прадпрыемствы, якія ёсьць у калгасе і пакуль што даюць нязначны прыбытак (малочны завод, кравецкая майстэрня). З другога боку—неабходна хутчэй прасунуць тыя крэдыты, якія вызначаны для калгасаў і выдача якіх тармозіцца раённымі арганізацыямі.

Брыгадзір «Зьвязды» **Халявін.**

Патрэбна хуткая дапамога

Недалёка ад г. Полацку, у масьўных арфяных балотах, знаходзіцца Абольскі завод торфа-ізаляцыйных пліт, які зьяўляецца адзіным у Беларусі і другім у СССР.

Справа па выпрацоўцы з торфу пліт для будаўніцтва ў нас, у СССР, зьяўляецца зусім новай, а таму вымагае да ябе асаблівай увагі і дапамогі з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Гісторыя заводу яшчэ занадта кароткая. Абольскі завод пачаў будавацца з восені мінулага году. На яго будаўніцтва адпушчана дзяржавай каля 700.000 рублёў.

Але, ня гледзячы на тыя вялізарныя грошы, якія ўкладваюцца дзяржавай, а тое, што прадукцыя, выпрацоўваемая заводам, надзвычай патрэбна нашаму будаўніцтву і на тое, што прадукцыя гэтага заводу зьвяцца высокакаштоўным экспартным матэрыялам — мясцовыя і акруговыя арганізацыі не аддаюць заводу ніякай увагі.

Мала гэтага. Тут нават ня ведаюць, што будзе выпрацоўваць завод. Ні акругком партыі, ні акрпрафбюро, ні, нават, райком не пацікавіліся заслухаць паведамленьне аб стане заводу.

Такі кансэрватызм мясцовых арганізацый прывёў да таго, што на сёнешні дзень будаўніцтва заводу сарвана на 50 проц., бо Лесбел ня выканаў дагавору на пастаўку лесаматар'ялаў, патрэбных на пабудову самога заводу, на кватэр для рабочых, каапэратыву, лазьні і г. д., якія меркаваліся скончыць да 1-га мая.

Калі паглядзець на стан заводзкіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый, з упэўненасьцю можна сказаць, што яны не дапамагаюць будаўніцтву заводу. Парт'ячэйка за 6-месячнае існаваньне не палічыла патрэбным заслухаць ні аднаго пытаньня, зьвязанага з будаўніцтвам і вытворчасьцю. Партыйцы не даюць аднору адсталым рвацкім настроям групы рабочых заводу.

Крытыкі і самакрытыкі няма. Член бюро парт'ячэйкі т. Лысоў «ня бачыць у крытыцы і самакрытыцы ніякай карысьці», бо паводле яго думкі, «навошта крытыкаваць недахопы і ўпушчэньні, калі ёсьць адміністрацыя, якая павінна за ўсім сачыць».

Сярод рабочых адсутнічае элемэнтарнае разуменьне аб працдысцыпліне. Кожны працуе так, як яму захочацца і колькі хоча. Дысцыплінарныя спагнаньні адміністрацыі не дапамагаюць і некаторыя партыйцы вымовы і звальненьні з працы за гультайства і няўўку на работу расцэньваюць, як «ганеньне за самакрытыку».

Усё пералічанае вышэй прымушае біць трывогу. Мы патрабуем ад адпаведных арганізацый зьмены сваіх адносін да заводу і тэрміновага ўзмацненьня заводзкай парт'ячэйкі.

ВЫПАДКОВЫ.

„25-тысячнікі" на працы

Прадпрыемствы і прафсаюзы забылі ся аб вылучаных на калгасную працу рабочых

У асноўным, па вестках Белкалгаспэнтру, рабочыя, мабілізаваныя для ўзмацненьня калектывізацыі і правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі ў лік «25.000»—скарыстоўваюцца добра.

З 615 рабочых, якія пасланы ў вёску — 327 працуюць у якасьці старшынь праўленьняў калгасаў, 75 — членамі праўленьняў калгасаў, 57 — старшынямі куставых аб'яднаньняў, 14 — членамі праўленьняў куставых аб'яднаньняў, 17—старшынямі райкалгассаюзаў і 57 — членамі праўленьняў райкалгассаюзаў.

Але побач з гэтым, у асобных выпадках частка «дваццаціпяцітысячнікаў» выкарыстоўваецца по па прызначэньні, не на кіруючай рабоце, ня маюць сталага месца працы і г. д. У Лагойскім раёне камандзіраваных рабочых пасылалі ў лес па дровы, скарыстоўвалі ў канцэляры ў якасьце дзелаводаў, перапісчыкаў і г. д.

Дрэнна стаіць справа ў некаторых мясцох з кватэрамі для «дваццаціпяцітысячнікаў». У тым-жа Лагойскім раёне рабочыя не забясьпечваліся кватэрамі і ім прыходзілася жыць ў кулакоў.

У радзе акруг адсутнічае ня толькі сувязь паміж вылучанымі рабочымі і сваімі прадпрыемствамі, але і з акркалгассаюзамі. У Менскім акркалгассаюзе назьбіраліся шмат лістоў рабочых «25.000-нікаў», у якіх яны просяць дапамогі па радзе пытаньняў. На працягу месяцаў рабочыя не атрымлівалі ніякага адказу на свае лісты. Вось сьвежы абураючы факт. Старшыня калгасу імя «Будзенага», Вузьдзенскага раёну, тав. **Федаровіч** напісаў ліст у акркалгассаюз, у якім задаваў рад тэрміновых, важнейшых палітычных запытаньняў, на якія прасіў тэрмінова адказаць, бо ня ведае як яму быць. Гэты ліст ляжыць больш 6-ці тыдняў без адказу. Такія-ж факты адзначаны і ў Аршанскай акрузе.

У Вабруйскай і Магілеўскай акругах справа сувязі акркалгассаюзаў з рабочымі пастаўлена адвальняюча. Склікаюцца раённыя і акруговыя нарады ўсіх «25.000-нікаў». Заслухоўваюцца даклады аб іх рабоце, аб узаемаадносінах з райкалгассаюзамі і прадпрыемствамі.

Вельмі слабая сувязь існуе паміж прадпрыемствамі і рабочымі-калгаснікамі. Прадпрыемствы абмежаваліся тым, што вылучылі рабочых, але умовамі працы вылучэнцаў не цікавяцца. Большасьць рабочых скардзіцца на цяганіну з выдачай ім зарплаты. На 2-3 м-цы «дваццаціпяцітысячнікі» не атрымліваюць розьніцы ў пэнсіі. Ёсьць выпадкі, калі жонкі рабочых пішуць сваім мужом, што ім не выплачваюць пэнсіі. СНК аб парадку выплаты пэнсіі «25.000-кам» і вылучэнцам, гэтых скарг стала менш.

Яшчэ горш пастаўлена сувязь рабочых са сваімі прафсаюзамі. За ўвесь час, што рабочыя працуюць на вёсцы, ні адно праўленьне прафсаюзаў не зварачалася ў Белкалгасцэнтр, каб даведацца, што пішуць і як працуюць рабочыя вылучэнцы — іх члены саюзу.

Зараз пры Калгасцэнтры створана спэцыяльнае кансультацыйнае бюро, якое будзе займацца выключна наладжваньнем сувязі і аказаньнем дапамогі «25.000-нікам».

А.

Да сплаву дроў яшчэ не прыступілі

МАЗЫР. (Наш кар.). Усяго на Мазыршчыне намечана для сплаву **273.760** куб. мэтраў будаўнічага матар'ялу і **129.055** куб. мэтраў дроў. Плян па сплаве будаўнічых матар'ялаў ужо выканан на 75 проц., **а да сплаву дроў яшчэ ня прыступлена.** Асабліва добра ідзе сплаў лесу ў **Пятрыкоўскім, Верхня - Піцкім, Лельчыцкім і Ельскім раёнах.** Пры сплаве **па Мухаедаўскім** канале ўдалося дабіцца патаненьня кошту сплаву **на 25%** супроць мінулага году. Вылучана спэцыяльная камісія **для прэміраваньня рабочых, якія займаліся сплавам па гэтым канале. У Пятрыкоўскім** раёне вылучан адзін канал, які на працягу двасіці год не працаваў. Гэта таксама дасьць значную эканомію сродкаў пры сплаве лесу.

Наглядаюцца нядбайныя адносіны **Белкаапсаюзу** да забесьпячэньня плытагонаў спэцвопраткай. Так, напрыклад, Белкаапсаюз замест ботаў для плытагонаў прыслаў Мазырскаму Лесбелу **900 пар дзіцячых сандаляй і жаночых чаравік.**

Забесьпячэньне прадуктамі пастаўлена дрэнна. Спажывецкія т-вы на мясцох пры завозе прадуктаў **ня ўлічылі патрэб плытагонаў.**

В.

Абураючы выпадак цкаваньня вынаходцы

Заводзкія арганізацыі не далі адпору рвачом і шкоднікам

Барацьба за рабочае вынаходніцтва—барацьба за выкананьне прамфінпляну

Тав. Лапіда—рабочы мэталіст з 35-гадовым рабочым стажам. 10 год ён працуе на менскім машынабудаўнічым зав. «Энэргія». Апошнія гады бурная будаўніцтва, прапаганда ідэі рацыяналізацыі разбудзілі ў ім творчую думку. Тав. Лапіда пачаў упарта думаць аб рацыяналізацыі свайго цэху і ў першую чаргу сваёй уласнай работы. Ён пачаў думаць над стварэньнем такой прылады, якая-б дала магчымасьць паскорыць праверку і кляйменьне сталовай вагі, замяніўшы працу рабочага-зборшчыка і палегчыўшы работу праверщчыка.

Але тав. Лапіда зьяўляецца ня толькі вынаходцам. Ён таксама адзін з лепшых кваліфікаваных рабочых і самааддана адносіцца да вытворчасьці. Калі на заводзе распачалася сацспаборніцтва, т. Лапіда паказаў лепшыя ўзоры інтэнсыўнасьці працы, узьняўшы яе амаль на 100 проц. Замест сярэдняй выпрацоўкі 185-190 руб. ён дабіўся ў маі мінулага году выпрацоўкі прадукцыі на 332 руб., што дало магчымасьць зьнізіць расцэнкі на 50 проц.

Гэта вельмі не спадабалася некаторым рвачом з вагавога цэху, якія былі больш зацікаўлены тым, каб працаваць менш і атрымліваць больш. Многа раз гэтыя рвачы рабілі Лапіду заўвагі—«Навошта табе так гнацца?»

Але Лапіда рабіў сваю справу. Так, напрыклад, каб палегчыць сваю работу, ён зрабіў прасьцейшай канструкцыі канвэер—у выглядзе звычайнай вагаэткі на рэйках, на якой яго памочнік накіроўваў яму дэталі і ён сам у сваю чаргу накіроўваў гатовыя вагі праверщчыку.

Канвэер адразу-ж паказаў сваю мэтазгоднасьць. Замест звычайных 28-30 ваг Лапіда пачаў выраблянь разам са сваім памочнікам 46 ваг за дзень.

Гэта яшчэ больш узбудзіла супроць яго рвачоў і шкурнікаў. Быў нават аднаго разу такі выпадак, што вядомы п'яніца, рабочы цэху, **Скуратовіч,** даў Лапіду 3 руб., каб ён пашоў на гарэлку. Калі-б Лапіда гэта зрабіў, ён даўбы повад рвачом выкінуць яго з цэху.

Даведаўшыся, што Лапіда думае над вынаходніцтвам, якое яшчэ больш паскорыла-б работу, рвачы парашылі ва што-б там ні стала вызваліцца ад нярымнага вынаходцы. Асабліва ўсхвалявала рвачоў тое, што ім прышлося-б адмовіцца ад дадатковай аплаты на 7-10 кап. за кожную вагу, якую яны атрымлівалі за падачу праверщчыку гір для праверкі правільнасьці вагі. **Гэты працэс работы**—падачу праверщчыку гір—**і павінна была замяніць прылада Лапіда.**

Але ён спадзяваўся, што можа з гэтай прылады нічога ня выйдзе. Але, калі прылада была гатова і на справе паказала сваю эфэктыўнасьць, рвачы цьвёрда парашылі пакончыць з Лапідам. Хутка была знойдзена і прычына.

Аднойчы тав. Лапіда заўважыў, што рабочы Гобэрман выробляе нядобраякасныя каромыслы да ваг, і заявіў аб гэтым загадчыку цэхам Абэзгаўзу, прычым адзначыў, што або Гобэрман ня ўмее працаваць, або шаблён для выпрацоўкі каромыслаў няправільны. Шаблён сапраўды аказаўся пагнутым. Скліканая пасьля работы цэхавая вытворчая рада знайшла ў гэтым факце момант шкодніцтва. І тут-жа так павярнулі справу, што вінаватым, як быццам, аказаўся Лапіда, ня гледзячы на тое, што ён першы заўважыў дэфэкт шаблёну і заявіў аб гэтым.

Лапіда быў арыштаваны і праседзеў пад арыштам **тры месяцы,** а прылада яго была закінута і, нарэшце, **парэзана,** бо рвачы заявілі, што бяз гэтай прылады можна зрабіць больш. А тое, што тут **асноўную ролю** адыгрываюць **7 кап.,** яны, зразумела, абышлі моўчкі.

На гэты абураючы факт арышту вынаходцы і псаваньня каштоўнай прылады не зьвярнулі сваёй увагі ні адміністрацыя, ні заводзкія арганізацыі. Рвачы і шкурнікі дзелаві стварыць наўкола Лапіда такую атмасфэру, што нават заводзкія арганізацыі, якія ведалі Лапіда толькі з лепшага боку, паверылі хлусьні, якую распускалі пра яго рвачы.

Калі Лапіда вызвалілі, ён падаў заяву аб прыёме яго зноў на работу. Але дырэктар заводу т. **Атрошка** падышоў да гэтай справы вельмі фармальна і адмовіў яму ў адпаўленьні на работе. Патрабавалася ўмяшаньне **АКК-РСІ,** каб растлумачыць заводакіраўніцтву пашы законы. **АКК-РСІ прапанавала заводакіраўніцтву аднавіць Лапіда на работе, а таксама аказаць яму поўную дапамогу ў ажыцьцяўленьні яго вынаходніцтва.**

Праект вынаходніцтва быў зноў перададзены на абгаварэньне цэхавай вытворчай нарады. На гэтай нарадзе асабліва выразна вызначыліся варожыя адносіны да вынаходцы. Сам старшыня вытворчай камісіі **Карасік,** да рэчы, член партыі, аказаўся ў хвасьце рвачоў. Ён нескалькі раз выносіў прапановы, каб прылада Лапіда ні ў якім разе ня была праведзена ў жыцьцё. Зразумела, што на нарадзе яго цалкам падтрымалі рвачы **Капілаў, Бусловіч** і інш. У хвасьце рвачоў пацягнуліся таксама загадчык цэхам **Абэзгаўз** і яго памочнік **Каза** таннымі аўтарытэтамі, якія ў пагоні **калі рабочыя пажадаюць** [illegible] супроць [illegible] Лапіда. І калі ўсё-ж нарада пастанавіла даць магчымасьць т. Лапіду паправіць сваё вынаходзтва, з «дадаткам» выступіў старшыня вытворчай камісіі Карасік і прапанаваў, каб Лапіду **на дзвелі добрых дэталяй пры выпрабаваньні яго вынаходцтва.**

Нарэшце, тав. Лапіда за работай. Але і тут яму перашкаджаюць. Загадчык цэхам некалькі раз у дзень падыходзіць да яго і адрывае яго ад работы крыватымі гутаркамі. Мэта лепая—не даць магчымасьці Лапіду паказаць якасьць сваёй прылады.

Толькі 4-га мая г. г. пакуты т. Лапіда скончыліся. Спэцыяльная камісія праверыла работу вынаходзтва і ўстанавіла поўны яго эфэкт. Калі бяз прылады тав. Лапіда выраблянь у дзень прадукцыі **на 4 р. 27 кап.** у сярэднім, то за 4 дні работы з прыладай ён выраблянь у сярэднім **на 8 руб. у дзень.** І гэта, ня гледзячы на тое, што т. Лапіда ў першы-ж дзень адмовіўся ад лішніх 7-10 кап., якімі раней аплачваўся працэс работы па падачы гір. За 4 дні прылада т. Лапіда дала заводу 4 р. 90 кап. эканоміі, **ня лічачы таго,** што дасягнута эканомія на іншых працэсах работы. Прылада т. Лапіда дае магчымасьць зрабіць у цэху перагрупоўку рабочых. Напрыклад, замест 3-х рабочых 5-га разраду, аднаго 4-га разраду і 2-х 2-га разраду **(разам 11 разрадаў)** можна паставіць аднаго 5-га разраду і 3-х 2-га разраду **(разам 7 разрадаў),** прычым прадукцыйнасьць працы 2-ой групы будзе нават павялічана **з 40 ваг у дзень да 50.** Вось якую эканомію павінна даць вынаходзтва т. Лапіда.

Цяпер, зразумела, чаму супроць тав. Лапіда і яго вынаходзтва адзіным фронтам выступілі рвачы цэху і хвасьцістыя.

Уся гэта гісторыя ня можа застацца без належнага рэагаваньня з боку адпаведных органаў. Неабходна гэту справу больш дэтальна расьсьледаваць, выявіць усіх вінаватых і прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

Мы ня можам дапусьціць, каб у перыяд напружанай барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за 4 гады, **калі рацыяналізацыя вытворчасьці і вынаходзтва набывае асаблівае вялікае значэньне** — магчымы былі такія абураючыя факты прасьледваньня і цкаваньня адданага вытворчасьці вынаходцы.

Мы патрабуем ад **пракуратуры** тэрміновага расьсьледваньня гэтай справы. Група рвачоў і шкурнікаў павінна быць прыцягнута да судовай адказнасьці. Таксама не павінны застацца без пакараньня ўсе тыя, што **патуралі** гэтаму цкаваньню вынаходцы і пагнаравалі фармальна вынаходцу [illegible] гэтай справы.

Брыгада «Зьвязды»—

БРАЙНІН, ПАЛІЧАНСКІ І ЗЭВІН.

ЗА ЯКАСЬЦЬ БУДАЎНІЦТВА!

Трывожны сыгнал з крычаўскага Першамайскага фасфарытнага заводу

Тэрмін пуску заводу сарваны.—Завод працуе з перабоямі.—Прамфінплян ня выконваецца

Некалькі слоў аб пабудове самога будынку заводу.

Пабудова гэта выконвалася вельмі кепска. Пляны і праекты не абмяркоўваліся на вытворчых камісіях і нарадах і шырокіх рабочых сходах з прычыны адсутнасьці адпаведнай работы з боку саюзу будаўнікоў і рабачкому № 12. На заявы рабочых аб дрэннай якасьці рошчыны ванны і на тое, што яна страціла змацоўваючую ўласьцівасьць ня было зьвернута ўвагі. Кладка фундаманту выканана агідненьшым чынам: на глыбіні мэтру быў закладзен бут і заліты рошчынаю 1:2:9. Як раз на такойжа рошчыне праводзілася, пры дрэннай якасьці пяску, кладка сьцен будынкаў, з прычыны чаго сьцену для трансьмісіі ў другім паверсе прышлося **ўмацоўваць бэлькамі,** бо пры прабіўцы дзірак **цэгла лёгка вымаецца рукамі.** Калі-ж было пастаўлена пытаньне на агульным сходзе і паказана на гэтыя непамальнасьці, будаўнік заводу тэхнік **Кажэўнікаў** заявіў: «Нас прабіраюць за дэфэкты, якія нібы маюць месца ў будаўніцтве, у той час, калі мы стараліся, эканомілі сродкі», прычым спаслаўся на інструкцыі і нормы, зусім замазаўшы пытаньне аб дрэннай рошчыне.

Ня гледзячы на сацспаборніцтва і ўдарніцтва, асноўныя тэрміны пуску заводу — **да 15-га сакавіка г.г.** — сарваны (завод пушчан у 20-ых чыслах красавіка). Прычыны: поўная няўвязка чарцяжоў, разьмераў будынку і фундамантаў з прысланым абсталяваньнем, перапраектаваньне іх на месцы, што выклікала шмат перароблак, на якія выдадзены лішнія сродкі і час. Несваячасовае паступленьне абсталяваньня і нядобраякаснасьць яго выкананьня (у прыватнасьці, трансьмісія, зробленая на заводзе «Камунар») прысылка часткамі, са значным спазьненьнем, адсутнасьць канавак для шпонак ва ўсіх валах трансьмісіі, прысылка і ўстаноўка неразьёмнага шківу для галоўнай трансьмісіі, няправільнае выкарыстоўваньне рабочай сілы, адсутнасьць належнага ўліку паступаючага абсталяваньня (на працягу тыдня не маглі вызьвіць колькасьць каўшоў для элеватараў, якія меліся ў наяўнасьці на заводзе), — усё гэта значна адсунула ўстаноўку машын і тэрмін пуску заводу.

Што робіцца зараз на заводзе?

Ці выраблены поўнасьцю задачы бесьперабойнай работы заводу? Далёка не... Захапіўшыся пускам заводу, спэцы і трэст ня ўлічылі самага галоўнага і асноўнага — выразнасьць работы, прадукцыйнасьць заводу, выпуск прадукцыі, патаненьне яе сабекошту, працэс размолу, у сувязі з чым на сёнешні дзень праз гравіясартоўку разам з пяском выкідваецца зусім добрая фасфарытная мука і часьці руды, да 200 пуд. у зьмену, што, паводле думкі інжынэра трэста т. Позьняка, зьяўляецца «зусім нармальным і дапушчальным». На заявы рабочых аб гэтым пры ўстаноўцы гравіясартоўкі ня было зьвернута ўвагі. Акрамя таго, маюць месца завалы печак, выраблены адвольна, без чарцяжоў, невыстарчальная працускная здольнасьць і няўвязка раду тэхнічных пытаньняў. У выніку, завод за 5-6 дзён работы ў дзьве зьмены даў значна менш, чым ён павінен быў даць у адны суткі (96 тон). Кіраўнік работ, ведаючы аб усім гэтым, не прыняў ніякіх мер да зьнішчэньня ненармальнасьцяй, кінуў завод і перад ад'ездам заявіў: «Завод пушчан, ідзе поўным ходам, мне тут няма больш чаго рабіць, я лепш дапамагу в Менску». Гэта дапамога відаць з таго, што завод з гадзіны працуе, а 5 стаіць.

Што прынята трэстам для мэханізацыі падачы руды з барж на завод і па патаненьні сабекошту прадукцыі?

Роўна нічога.

Праект, прысланы трэстам па мэханізацыі падачы руды, толькі прамільгнуў у справах заводу. Абяцалі выслаць спэца для складаньня рабочых чарцяжоў («Мельстрой»). Але да гэтага часу нічога ў гэтай галіне ня зроблена. Руда, якая прыбывае з распрацовак, зьмяшчае ў сабе значную колькасьць пяску. Падвозіцца яна з берага на конях, ручным спосабам выгружаецца і на насілках выносіцца на завод.

З лазьняй і вэнтыляцыяй справа стаіць ня лепш: рабочыя задыхаюцца ад пылу фасфарытнай мукі і гэта ў той час, калі парт'ячэйка на сходзе ў прысутнасьці кіраўніка трэстам ва ўсю шырыню паставіла пытаньне аб тэрміновым абсталяваньні заводу вэнтыляцыяй. Тэхніка бясьпекі і мерапрыемствы на бясьпецы працы адсутнічаюць. Пажарная справа стаіць вельмі кепска. Пры наяўнасьці пажарнага дэпо і вадападземнага будынку не ўстаноўлена ні адной вадаразборнай калёнкі на тэрыторыі заводу і ні аднаго крану ў будынку самога заводу, не гаворачы ўжо аб падачы ў кватэры рабочых.

Ня лепш стаіць справа і з пытаньнем рабочага забесьпячэньня — гутаркі, гутаркі, абяцаньні і толькі. Крычаўскае спажывецкае т-ва ў гэтай галіне ніякім мер ня прымае. Ёсьць выпадкі адыходу кваліфікаваных рабочых з прычыны адсутнасьці прадуктаў першай патрэбы.

Усе гэтыя агідненьсьці рабіліся над самым носам рабачкому № 12 саюзу будаўнікоў, які за тры апошніх месяцы у самы разгар работы, не патурбаваўся правесьці ні аднаго агульнага сходу, ні вытворчай нарады, нават не пацікавіўся станам работы на заводзе.

Недалёка адышоў і ЦП саюзу хэмікаў. Ня гледзячы на цэлы рад просьбаў парт'ячэйкі і дырэкцыі, ЦП скромна і наіўна адказвае: «Прыедзем у першых чыслах красавіка, гэтымі днямі прыедзем і арганізуем заўком.

Неабходна ЦСПСБ падштурхнуць ЦП хэмікаў, а хэмаб'яднаньню неадкладна камандыраваць спэцыялістага-фасфарытніка для наладжаньня нармальнай работы заводу, бо, калі прамаргалі веснавую пасеўную кампанію, дык гэта ня значыць, што трэба прамаргаць і асенняю кампанію.

Ф—а.

Вянок бюракратаў на магілу гэроя

Усім вядомы закон савецкай улады аб увекавечаньні памяці чырвоных гэрояў, загінуўшых на франтох грамадзянскай вайны. Усім вядома таксама, што савецкая ўлада і партыя робіць усё для таго, каб імёны гэтых гэрояў засталіся назаўсёды на старонках гісторыі слаўтай барацьбы за Кастрычнік, а іх сем'і былі пастаўлены ў магчымы найлепшыя ўмовы. Адсюль цэлы рад шырокіх льгот сем'ям чырвоных гэрояў, пачынаючы ад льготы на падатку да дармовага навучаньня ў школах іх дзяцей.

Толькі нядаўна працоўныя Савецкага Саюзу з радасьцю і пашанай сустракалі сваіх чырвоных гэрояў-байцоў, што варочаліся з Далёка-Ўсходняга фронту. На кожнай станцыі, у кожным горадзе яны сустракаліся з непадзельным энтузіязмам і любасьцю шырокіх працоўных мас. Усе свае дамы адпачынку і санаторыі яны гасьцінна адмянілі перад тымі, хто сваімі грудзьмі ўраўчна абаранаў савецкую мяжу на далёкім Усходзе.

Гэта — ня толькі часовая ўрачыстасьць. Рабочая кляса і бядняцка-серадняцкія масы, якія стваралі сваю Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію, ніколі не парывалі з ёю цеснай сувязі, заўсёды акружалі яе самай шчырай павагай і любасьцю. А тых, хто аддаў сваё жыцьцё за справу Кастрычніка, яны увекавечваюць на старонках гісторыі сваёй рэвалюцыйнай барацьбы.

Нам асабліва горка адзначаць, калі ў гэту павагу працоўных мас да сваіх гэрояў уплятаецца бюракратычная туманасьць, нічым неапраўданая няўважлівасьць да памяці і сям'і чырвонага гэроя, загінуўшага ў барацьбе на баявым посту. Але адзначаць гэта трэба для таго, каб паказаць, што партыя і ўлада будуць рашуча біць на руках усіх тых, хто адважыцца ня выконваць ці абыходзіць законы і дырэктывы аб сем'ях чырвоных гэрояў.

Тут будзе расказана аб тым, як Менскі АВК адыграў нядобрую ролю ў справе папулярызацыі змагароў-гэрояў, дапусьціўшы нячувана бюракратычныя адносіны да памяці і сям'і аднаго з такіх гэрояў. Імя яго — Уладзімер Рэўт — камандзір разьвядзелу кавпалка войск АДПУ. Загінуўшы ўвосень 1927 году сьмерцю адважных у барацьбе з бандытамі на далёкім Ахоцкім узьбярэжжы. Тав. Рэўт паходзіў з сялян в. Гумніўча, Барысаўскага раёну, Менскай акругі, дзе і цяпер жывуць яго бацькі. У 1918 годзе т. Рэўт, будучы 15-гадовым хлапчуком, добраахвотна ўступае ў рады Чырвонай арміі, у якой знаходзіцца да сваёй сьмерці. Незадоўга да сьмерці—у 1926 г. — ён становіцца кандыдатам УсеКП(б). Памёр ён як камандзір-камуніст.

Мы мелі магчымасьць азнаёміцца з паслужным сьпісам камандзіра разьвядзелу Рэўта, што прысланы нядаўна камандаваньнем кавпалка ў ЦВК. У гэтым сьпісе т. Рэўт характарызуецца, як узор цьвёрдага, настойлівага, да канца адданага рэвалюцыйнай справе камандзіра-змагара. Гэтыя якасьці т. Рэўта былі матывам таго, што яму была даручана адказная апэрацыйная камандыроўка на ліквідацыі белай банды на Ахоцкім узьбярэжжы. У гэтыя бі тав. Рэўт, зьяўляючыся ўзорам для чырвонаармейцаў, загінуў. Вось што мы чытаем у загадзе па кавпалку АДПУ ад 4-га сакавіка 1929 году № 38: «За праявленную беззаветную безграніччную преданность делу революции, достойную служить лучшим примером в воспитании революционных боевых традиций органов войск ОГПУ, приказываю: командира взвода т. Реут Владимира Доминкова и красноармейцев т.т. Иваненкова Н. И. и Потанина А. В. зачислить навсегда в списки 2-го полка войск ПП ОГПУ ДВК».

Такім чынам, т. Рэўт заслужыў вышэйшай вайсковай пашаны—залічэньня **наз

Не дапусьціць аслабленьня работы МОПР'у

Замацаваць актыўнасьць калгасьнікаў, што ўступілі ў МОПР

Работа МОПР'у ў летні час

У сувязі з наступленьнем летняга перыяду, усе віды, формы і мэтады агітмасавай работы МОПР'у павінны ў корані мяняцца. Нашым ячэйкам МОПР'у трэба дастасавацца да летніх умоў, але ні ў якім разе не дапусьціць паслабленьня работы. Нізавым ячэйкам МОПР'у трэба адмовіцца ад тэй думкі, што летам павінна ўся работа, у тым ліку і работа МОПР'у, аслабіцца. З гэтай думкай ніяк нельга згадзіцца, бо ў летні час наша маральная і матар'яльная дапамога барацьбітом рэвалюцыі яшчэ больш патрэбна ў сувязі з абвастрэньнем клясавых боек паміж пралетарыятам і капіталістымі.

Летняя адпускі таксама ня могуць быць прычынай аслабленьня тэмпаў работы, бо пралетарская маса вызваляецца ад агульна-адукацыйнай і партыйнай вучобы ў школах, партшколах і на розных курсах, сярод якіх можна разгарнуць вялікую масавую работу і якіх таксама можна прыцягнуць да актыўнай практычнай мопраўскай работы ў ячэйках. Нашы ячэйкі МОПР'у павінны летам скарыстаць зімовыя клюбы, дзе можна праводзіць масавую работу, у той-жа час трэба вынесьці ўсю масавую работу з чырвонага кутка, пардому або клюбу на вольнае паветра—у летні сад, лес, каля рэчкі. У летні час перад усімі ячэйкамі адкрываецца шырокае поле дзейнасьці ў галіне правядзеньня масавых мерапрыемстваў (маёвак, экскурсій рабочых і служачых у бліжэйшыя вёскі, калгасы, чырвоаармейскія лягеры, у рэвалюцыйна-гістарычныя месцы), якія ёсьць у кожным раёне гораду і вёскі, або запрашаюцца калгасьнікі, саўгасьнікі ў горад з бліжэйшых вёсак на інтэрнацыянальныя вечары-гульні ў летніх садох.

За летні час трэба шырока скарыстаць масавыя інтэрнацыянальныя вечары ў летніх садох або ў клюбах з мэтай папулярызацыі задач шэфства над палітзьняволенымі, з кароткімі дакладамі аб становішчы палітзьняволеных у падшэфных турмах, з мэтай праверкі выкананьня сацспаборніцтва паміж ячэйкамі МОПР'у і правядзеньня вечароў са макрытыкі, выяўленьня недахопаў у рабоце МОПР'у.

Усім бюро ячэек МОПР'у трэба падумаць адносна замены таго ці іншага члена бюро ячэйкі на час водпуску, не дапускаючы, каб усе члены бюро пайшлі ў водпуск у адзін час, бо гэта ў значнай меры аслабіне работу ячэйкі МОПР'у ў летні перыяд.

Улічваючы практыку мінулага году, МенАК МОПР'у павінен будзе арганізаваць некаторыя масавыя мерапрыемствы (інтэрнацыянальныя экскурсіі, вечары з удзелам выдатных рэвалюцыянэраў). МенАК МОПР'у прыдзецца праводзіць шырокую работу сярод сэзоньнікаў, якія тысячамі ў летні час заняты на пабудовах у Менску і ў раённых цэнтрах.

Сярод сэзоньнікаў трэба будзе арганізаваць кароткатэрміновыя курсы і асобныя масавыя сходы на пабудовах з тым, каб з іх падрыхтаваць МОПР-арганізатараў на вёсцы.

Неабходна ў бліжэйшы час правесьці шырокія канфэрэнцыі пралетарскага студэнцтва ВДУ, камвузу, тэхнікумаў у горадзе і ў раёнах з мэтай скарыстаньня студэнтаў для мопраўскай работы на вёсцы ў часе летніх вакацый, а таксама трэба будзе шырока скарыстаць як у горадзе, так і ў раённых цэнтрах усялякія курсы перападрыхтоўкі, канфэрэнцыі настаўнікаў, якія праводзяцца па лініі Наркамасьветы і сацвыху.

Наша баявая задача на летні час—усё зрабіць для таго, каб узмацніць нізавую ячэйку і паглыбіць інтэрнацыянальнае выхаваньне сярод працоўных.

ЦУДЗІН.

Яшчэ аб новых формах і мэтадах работы

Лёзунг партыі «Тварам да вытворчасьці» павінен быць поўнасьцю дастасаваны да работы мопраўскіх арганізацый.

Уся аснова ў рабоце МОПР'у на заводзе і фабрыцы павінна быць перанесена ў цэх або зьмену. Трэба зараз-жа ўзяцца за арганізацыю цэхавых і зьменавых ячэек, якія павінны займацца ня толькі вузка цэхавымі пытаньнямі (дапамога палітзьняволеным), але прымаць актыўны ўдзел у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінплянаў, за актыўны ўдзел членаў МОПР'у ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве

Трэба ў дзяцінстве [illegible] арганізацыям улічыць пераход прадпрыемстваў на [illegible] работы [illegible] і [illegible] сваю работу, прыстасоўваючыся да гэтых умоў работы.

У жыцьці нашай вёскі таксама маем вялікія зьмены. Калгасная будаўніцтва патрабуе дастасаваньня работы МОПР'у бліжэй да кожнай вёскі, якая ўваходзіць у той ці іншы калгас або куст. Цэнтрам калгасных ячэек МОПР'у павінен быць куст. У кожнай асобнай вёсцы калгасу павінна быць арганізавана самастойная ячэйка МОПР'у, выбрана бюро і рэвіз. камісія. Кустовое бюро калгасаў выбіраецца на агульнай канфэрэнцыі ячэек МОПР'у, якія ўваходзяць у даны куст або калгас.

У вайсковых часьцях таксама ўносяцца некаторыя арганізацыйныя зьмены. Уся ўвага павінна быць накіравана на ўзмацненьне цэхавай ячэйкі (роты, эскадрону, батарэі), дзе выбіраюцца самастойныя бюро і рэвіз. камісіі. Акрамя таго, са складу ўсіх бюро ячэек выбіраецца палкавы МОПР - арганізатар, які праводзіць інструкцыйныя нарады з актывам ротных або эскадронных бюро ячэек МОПР'у.

У жактаўскіх ячэйках МОПР'у ў аснову бярэцца ячэйка пры чырвоным кутку ЖАКТ'у, акрамя таго ў кожным доме, які аб'ядноўваецца ЖАКТ'ам, выбіраецца квартальны МОПР - арганізатар.

Усе гэтыя задачы могуць быць цалкам праведзены ў жыцьцё толькі ў тым выпадку, калі мы даб'емся **пэрсанальнай адказнасьці кожнага мопраўскага работніка за даручаную яму работу.** З усіх кіруючых МОПР-арганізацый павінны быць выведзены ўсе **«ганаровыя засядацелі»** і заменены больш працаздольнымі работнікамі з нізоў—фабрык і заводаў.

С. БРАЙНІН.

Больш увагі мопраўскай арганізацыі

(ЗАСЛАЎЕ)

На сёньнішні дзень у Заслаўскай раённай арганізацыі налічваецца 35 МОПР-ячэек з лікам 2.100 членаў. Большасьць ячэек працуе здавальняюча. За апошні час Ратамская, Нсвадворская, Вялікасельская, Старасельская, Баруўская і Радашковіцкая ячэйкі МОПР'у аслабілі сваю работу з-за адсутнасьці кіраўніцтва з боку партыйных ячэек.

Па заданьні Мен. АК МОПР'у аб зімовай дапамозе палітзьняволеным замест 200 руб. мы сабралі 512 р. 42 к. Заданьне выканана, як быццам, ня дрэнна, але ня ўсе ячэйкі прымалі ўдзел у гэтай кампаніі. Ня ўсе, якія далі 114 руб. на кампаніі зімовай дапамогі, на куплю аблігацый [illegible] палітзьняволеных — 59 руб.

Двухтыднёвік вярбоўкі камсамолу ў МОПР даў на вайсковых ячэйках 100-процантны рост.

Ня ўсе члены РК прымаюць удзел у рабоце МОПР'у. Такія члены РК, як **Шыцькоўскі, Мядзьведзь, Чавіраў, Макарэвіч і Душчынскі** ніякай адказнасьці не адчуваюць за работу ў РК і ніякай работы не праводзяць.

Перад мопраўскай арганізацыяй Заслаўя стаяць вялізарнейшыя задачы па павялічэньні радоў на 500 проц., перапісьненьні работы МОПР'у ў калгасы, напісьненьні работы МОПР'у ў калгасы, павялічэньні збору сродкаў і ўзьняцьці працаздольнасьці нізавога актыву бюро ячэек МОПР'у, для чаго неабходна і ў далейшым практыкаваць кароткатэрміновыя курсы з прыцягненьнем актыву ад калгасаў, саўгасаў і вёсак.

АКСЕНЧЫК.

Дзень МОПР'у ў калгасе

(Багушэўскі раён, Аршаншчына)

Нядаўна адбыўся агульны сход калгасьнікаў і іх сем'яў, на якім быў пастаўлен даклад аб задачах МОПР'у. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі калгасьнікаў, якія ўсе прапанавалі ўступіць у МОПР і арганізаваць ячэйку. Паслаць ліст палітзьняволеным Беластоцкай турмы. Па надніснім лісьце сабрана 22 руб. 07 кап. Характэрна тое, што гэты **калгас складаецца з 20 гаспадарак, у большасьці з беднякоў і батракоў, і некаторыя ахвотна падпісаліся па 3 руб. у карысьць МОПР'у.**

У МОПР уступіла 47 чал.

ГАЙСЁНАК.

НЕ ПРЫПЫНЯЦЬ ЗБОРУ ПОПЕЛУ

Прыцягваць да адказнасьці прадпрыемствы і жакты, якія ня зьбіраюць попелу, і калгасы, якія яго свая-часова не забіраюць

Практыка збору попелу для патрэб веснавой пасеўнай кампаніі ўжо дазваляе зрабіць некаторыя папярэднія вынікі, якія трэба ўлічыць у далейшай рабоце ў гэтай галіне.

Дзякуючы сабранаму попелу, мы ў радзе месц па балотнай глебе ўнікнулі зрыву сяўбы, бо калійных угнаеньняў амаль не атрымалі. У прыватнасьці гэта датычыць буйных мэліярацыйных масываў, як напрыклад, Мар'іна. Вялікі попыт на попел, які прад'яўляла значная колькасьць калгасаў, гаворыць аб тым, што каштоўнасьць попелу, як угнаеньня, у радзе месц даволі ўсьвядомлена.

Далёка ня ўсе акругі выканалі поўнасьцю плян збору попелу. Асабліва адставала Полацкая округа. Акрамя таго попел пераважна зьбіраўся па гарадох. Мястэчкі і вёскі рэдка дзе займаліся гэтай справай. Гэтыя недахопы тлумачацца ігнараваньнем справы збору попелу мясцовымі зямельнымі арганізацыямі і асабліва бязьдзейнасьцю зямельных органаў і калгасна-каапэрацыйнай сыстэмай на мясцох і нават у некаторых акругах. Увага вясковай грамадзкасьці да гэтай справы прыцягвалася гэтымі арганізацыямі надзвычай слаба.

Калгасна - каапэрацыйная сыстэма і зямельныя органы ня прымалі належных мер да таго, каб мясцовыя адміністрацыйныя органы сачылі за абавязковым выкананьнем прадпрыемствамі, жактамі і домакіраўніцтвамі пастаноў гарсаветаў, РВК і сельсаветаў аб зборы попелу. У выніку значная колькасьць прадпрыемстваў, жактаў і домакіраўніцтваў попелу зусім ня зьбіралі.

Асабліва культала справа транспартаваньня попелу. Адзначан рад фактаў, калі на прадпрыемствах і ў скрынках жактаў зьбіралася шмат попелу, а прымацаваны да іх калгасы месяцамі не забіралі яго. Попел намакаў і псаваўся. РСІ прымушана была нават прыняць меры супроць некаторых калгасаў за такія абураючыя адносіны.

Яшчэ горшая справа з перакідкай попелу з некаторых акруг на буйнейшыя калфонды. Так, напрыклад, Віцебск, які павінен быў даць Мар'інскаму калфонду некалькі дзесяткаў вагонаў попелу, зусім адмовіўся выканаць гэтае заданьне. Асноўная прычына такіх зьявішч—«местические» настрої [illegible] Прычым зусім ня прымалася пад увагу, што на мэліяраваных масывах патрэбнасьці ў попеле вялізарныя, што [illegible] попелу ў той час, калі ўласныя калгасы могуць пры такіх абставінах абыйсьціся і без яго.

Камсамол аказаў вялізарную паслугу ў справе збору попелу. Аднак, быў рад фактаў, калі земорганы і паліводсаюзы ня толькі не дапамагалі яму і кіравалі справай, а нават перашкаджалі ёй і зрывалі збор (непрадастаўленьне фурманак і г. д.).

Летні час зусім не вызваляе земорганы і калгасна-каапэрацыйную сыстэму ад абавязку зьбіраць попел. Трэба, урэшце, паставіць гэту справу на належную вышыню, ліквідаваўшы тыя недахопы, якія мелі месца на практыцы ранейшага збору. Гэта значыць, што трэба дабіцца, каб і ў горадзе і вёсцы попел зьбіраўся ўсімі. Усе округі і раёны павінны цалкам выканаць свае пляны. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на тое, каб калгасы своячасова забіралі попел з тых прадпрыемстваў і жактаў, да якіх яны прымацаваны. У адваротным выпадку трэба прыцягваць кіраўніцтва адпаведных калгасаў да адказнасьці. Неабходна дабівацца прыцягненьня да адказнасьці тых прадпрыемстваў, жактаў і домакіраўніцтваў, якія ня зьбіраюць попелу, або дрэнна яго захоўваюць, на падставе існуючых пастаноў мясцовых саветаў. Калі такіх пастаноў няма, трэба дабіцца іх выданьня.

А. АРАНОВІЧ.

МЕНСК

Падрыхтоўка да будаўніцтва новай менскай электрастанцыі

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ быў заслуханы даклад аб падрыхтоўцы да будаўніцтва новай менскай электрастанцыі. Прэзыдыум прызнаў неабходным пабудаваць да 1932-1933 году новую цёплаэлектрычную станцыю магутнасьцю ў **15.000 кілёват.** Энэргбюро даручана тэрмінова заказаць у Ленінградзе патрэбныя турбіны і катлы. Даручана таксама заключыць умову з Электрабудам на распрацоўку канчатковага тэхнічнага праекту новай цёпла - электрацэнтралі, рэканструкцыю гарадзкой сеткі. Наркамзему і Менакрвыканкому запрапанавана падрыхтаваць праект электрафікацыі сельска - гаспадарчых раёнаў вакол Менску.

* * *

Мен. камгас прыступіў да заключэньня дагавароў з жактамі на перадачу ім муніцыпалізаваных дамоў. Ужо заключаны дагавары з 16-ю жактамі.

* * *

Гарсавет запрапанаваў камгасу набыць новую аўтамашыну для пажарнай каманды і ў 20-цідзенны тэрмін вызначыць пляц для пабудовы пажарнага дэпо.

* * *

Менская фабрыка «Кастрычнік» сьпыняе на два тыдні працу для падрыхтоўкі да зімовага сэзону і пераходу на бесьперапынку. 400 рабочых фабрыкі па гэты час будуць пасланы ў дамы адпачынку.

* * *

Саюз мэдсанпрацы заключыў сацыялістычны дагавор з будаўнікамі, паводле якога саюз мэдсанпрацы абавязуецца ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 1000 сэзоньнікаў.

* * *

Варпітсо арганізуе ў Менску вячэрнія 4-х і 9-месячныя курсы па падрыхтоўцы рабочай і сялянскай бяднацкай моладзі на мэдфак. Усяго на курсы будзе залічана 100 чалавек. Заняткі пачнуцца з 20-га мая.

* * *

Саюз працасьветы сёлета пасылае на курорты 70 асьветнікаў, што задаволіць амаль на 100 проц. заявы членаў саюзу, якія маюць патрэбу ў курортным лячэньні.

* * *

З 15 мая да 20 чэрвеня ў Менску адбудуцца перавыбары мясцкомаў і групкомаў саюзу камунальнікаў.

* * *

16-га мая склікаецца Менская акруговая нарада інспэктароў нарасьветы. На нарадзе будуць абгавораны вынікі зімовай працы на лікпунктах і пераход школ на бесьперапынны навучальны год.

Апрача таго, будзе заслуханы даклад аб ліквідацыі няпісьменнасьці ў летні час сярод батрацтва, калгасьнікаў і ра-

* * *

Менская акруговая пажарная інспэкцыя скончыла рэарганізацыю пажарнай справы ў раёнах. Пры ўсіх калгасах будуць арганізаваны пажарныя дружыны. Уведзена новая пасада вучасткоўга пажарнага інструктара, які будзе кіраваць працаю пажарных дружын па 3-х раёнах. На гэтыя пасады прызначаны курсанты, скончыўшыя ўсебеларускія пажарныя курсы.

* * *

Наркамправы БССР згадзіўся на час іспытаў і канфэрэнцыі завочнага рабфаку вызваліць ад працы і захаваць пэнсію за рабочымі студэнтамі завочнага рабфаку, якія працуюць на прадпрыемствах БССР, па тэрмін да 4-х дзён.

* * *

З 15-га мая ў Менску адкрываюцца 3-хмесячныя курсы рахункаводаў для калгасаў. Усяго на курсы прынята 30 чалавек.

Загатоўка ўтыльсырцу ў калгасах

Наркамгандаль БССР і Белкалгасцэнтр выдалі пастанову аб большым ахопе загатоўкамі утыльсырцу калгасаў для стварэньня экспартнага фонду на ўвоз у БССР трактараў.

Пастаноўлена арганізаваць спэцыяльныя брыгады і вылучыць упоўнаважаных зборнічыкаў па калгасам для вядзеньня загатовак. Калгасы за здадзены ўтыльсырэц **будуць прэм'явацца дэфіцытнымі прамтаварамі ў першую чаргу. Каштоўнасьць прынятага ад членаў калгасаў утыльсырцу і прэмія поўнасьцю выдаюцца калгасьнікам, якія здалі гэты ўтыль.**

Калгасаюзам забаронена прымушаць калгасы здаваць утыльсырэц у аплату крэдытаў і інш. запазычанасьці калгасаў.

Ліст амэрыканскіх рабочых

Гэтымі днямі **рабочыя Менскай лямцавай фабрыкі атрымалі на мове эспэранто ліст ад рабочых 24-х амэрыканскіх арганізацый,** у тым ліку ад рабочых амэрыканскага пэрыцынскага прафсаюзу, саюзу рабочых эспэрантыстых, саюзу амэрыканскіх рабочых спартсмэнаў, ЦК Мопру, Вэнгэрскага т-ва прыхільнікаў Савецкага Саюзу і інш.

У сваім лісьце амэрыканскія рабочыя перадаюць прывітаньне менскім рабочым ад рэвалюцыйнага пралетарыяту Амэрыкі, у зьвязку з першамайскімі ўрачыстасьцямі.

У прывітаньні гаворыцца, што клясавая барацьба ў Амэрыцы са дня ў дзень абвастраецца.

Расьце забастовачны рух, часта назіраюцца крывавыя вулічныя бойкі з паліцыяй, павялічваецца колькасьць дэманстрацый беспрацоўных і лік забітых паліцыяй таварышоў. **Амэрыканскі пралетарыят прымае актыўны ўдзел у барацьбе разам з сусьветным пралетарыятам супроць капіталістычнага ладу.**

Амэрыканскія рабочыя заўсёды гатовы абараняць Савецкі Саюз — першую крэпасьць сусьветнага пралетарыяту. Толькі ідучы па шляху расійскага пралетарыяту, які зьнішчыў капіталістычны лад, рабочыя ва ўсім сьвеце змогуць сьвяткаваць вольна дзень 1-га мая —канчаюць свой ліст амэрыканскія рабочыя.

З лістоў рабсель кораў

ЦЬВІЛЫЯ ПЕРНІКІ

Магілеўскае аддзяленьне Дняпрасаюзу атрымала ад менскай фабрыкі «Камунарка» дзьве партыі пернікаў на суму 4.000 рублёў. Вадай усе яны сапсаваны і цьвілыя.

РСІ павінна зараз-жа гэтым зацікавіцца.

Рабкор Брук.

АНТЫСАНІТАРНАЕ СТАНОВІШЧА БОЛЬНІЦЫ

Пры вузьдзенскай райбольніцы адсутнічае прыёмны пакой. Няма там халатаў і сандаляў. Зусім у дрэнным становішчы знаходзіцца радзільны пакой, бо праз яго праходзяць. Справа з санітарыяй стаіць дрэнна. Адсутнічаюць чайнікі, кіпяток прыносіцца ў непакрытых вёдрах.

РВК зьвярні ўвагу.

Г. І.

НЯМА ДАПАМОГІ

Старшынёю В. — Бокаўскага сельсавету, Каралінскага раёну (Мазырчыны) [illegible] работы вылучэнец тав. **Навіцкі.** Апошні прыступіў да працы, але ён ня мае ніякай дапамогі. У сельсавеце няма сакратара і тэхнічнага працаўніка.

Ня раз ставілася пра гэта пытаньне перад РВК, але ніякіх вынікаў.

А.

ДАПАМАГАЕМ КАЛГАСЬНІКАМ

Рабочыя заводу **«Пралетары»** (Старыя дарогі) пастанавілі правесьці электрычнасьць у калгас «Расьсьвет новага жыцьця» і ўжо распачалі там гэтую работу.

Верас.

Рабкоры рыхтуюцца да партзьездаў

11-га мая адбыўся агульна - гарадзкі сход рабкораў **Менску** сумесна з камвузаўцамі. На сходзе прысутнічала каля 300 чалавек.

З дакладам аб падрыхтоўцы да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) выступіў загадчык культпропам ЦК КП(б)Б тав. **Сянкевіч.**

Тав. Сянкевіч падрабязна спыніўся на задачах рабкораў у падрыхтоўцы да партзьездаў.

У сваім выступленьні прадстаўнік рэдакцыі газ. **«Правда»** тав. **Нікіцін** заклікаў рабкораў Беларусі прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да зьезду, прысылаць матар'ялы у «Правду» аб рабоце партыйных, прафэсыянальных і іншых арганізацый Беларусі.

Па дакладах разгарнуліся жвавыя спрэчкі. Выказалася каля 15 чалавек рабкораў.

Сход пастанавіў паслаць прывітаньне рэдакцыям газэт «Правда» і «Зьвязда».

Пачынаюцца летнія лесазагатоўкі

З 15-га мая па праграме Лесбелу распачынаюцца летнія лесазагатоўкі і вываз лесу.

Акрамя неабходнасьці скончыць зімовую праграму **ў 2.300.000** кубамэтраў — за летні пэрыяд загатовак, **Лесбелу** дана заданьне загатовіць будаўлянага лесу **540.000** кубамэтраў і вывезьці за гэты-жа час **1.480.000** кубамэтраў рознага лесу.

Летні пэрыяд лесазагатовак працягваецца **з 15-га мая да 10-га ліпеня.** Гэты тэрмін пры вялікай праграме летніх работ вельмі малы і патрабуе напружанасьці ў працы і добрае яе арганізацыі.

Галоўнейшай задачай сёньняшняга дню зьяўляецца забесьпячэньне летніх лесазагатовак патрэбнай рабочай сілай.

Наркампрацы заяўляе, што сваім апаратам ён ня зможа забясьпечыць летнія лесазагатоўкі патрэбнай рабочай сілай і што калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, плян летніх работ можа быць сарваны. Перад нізавымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі стаіць задача — дабіцца ў што-б ні стала забесьпячэньня летніх лесазагатовак патрэбнай рабочай сілай.

Дрэнна стаіць справа з забесьпячэньнем лесазагатовак неабходнымі прамтаварамі і прадуктамі для прэм'яваньня лесарубаў. Тыя астаткі прамтавараў, якія засталіся ад зімовых лесазагатовак, Наркамгандлем БССР перанесены з фондаў прэм'яваньня лесазагатоўцаў у іншыя фонды.

Такія адносіны зацікаўленых установаў да пытаньня забесьпячэньня лесазагатовак рабсілай і прамтаварамі ставяць летнюю праграму з самага пачатку ў вельмі цяжкае становішча.

Неабходна зараз-жа мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці вакол пытаньня забесьпячэньня лесазагатовак і лесавывазу патрэбнай рабочай сілай і прамтаварамі.

А.

Радыё-перадача

АЎТОРАК, 13-га мая

17-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
17-30—Час пралетарскага студэнцтва.
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу.
19-00—Камсамольская перадача.
19-30—Навукова-тэхнічная перадача.
20-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
21-30—Канцэрт.

СЕРАДА, 14-га мая

17-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
17-30—Перадача для піянэраў і вучняў.
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу.
19-00—Беларуская работніца і сялянка па радыё.
20-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё (сканч. курсу навучан.).
21-00—Вывучэньне нямецкай мовы.
21-30—Канцэрт.

ЧАЦЬВЕР, 15-га мая

17-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
17-30—Час абароны краіны і Чырвонай армії.
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу.
19-00—«Чырвоная Зьмена» па радыё.
20-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё (Канец вучэбных перадач. У мікрафона Праўленьне Унівэрсытэту і студэнты).
21-30—Канцэрт.

ПЯТНІЦА, 16-га мая

18-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
18-30—Перадача для піянэраў і вучняў.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Сялянская радыё-газэта.
21-00—Перадача на мове эсэпэранто.
21-30—Гутарка: аб прымітэках—праф. Эльбэрт (для ўрачоў).
22-00—Канцэрт.

СУБОТА, 17-га мая

18-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
18-30—Палітычная перадача.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Літаратурна-музычная перадача.
21-00—Гутарка: буйная рабатая жывёла на ўсебеларускай выстаўцы—Ляховіч.
21-30—Канцэрт.

НЯДЗЕЛЯ, 18-га мая

9-30—Бязбожны ранішнік.
10-40—Палітычна-эканамічны агляд за тыдзень.
11-20—Сьпявайце разам з намі.
12-00—Агляд сёньнішніх цэнтральных і мясцовых газэт.
18-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
18-30—Перадача для піянэраў і вучняў.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—«Чырвоная Зьмена» па радыё.
21-00—Газэта на літоўскай мове.
21-30—Канцэрт.

ПАНЯДЗЕЛАК, 19-га мая

18-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
18-30—Беларускі Батрак.
19-00—Беларуская радыё-газэта.
20-00—Праверка часу.
20-00—Сялянская радыё-газэта.
21-00—Камсамольская вячэрка.
21-30—Гутарка: «Ангіна і дыфтэрыт»—праф. Бурак (для ўрачоў).
22-00—Канцэрт.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Вячэрняя саўпартшкола. Падагуленьне працы на 1 і 2 курсах і дача характарыстык з 13 па 15 мая. Яўка слухачоў абавязкова.

[illegible] у 20 гадз. палітгурток дашкольнай цэх'ячэйкі ЛКСМ.

Пушкінская біб-ка. У 19 гадз. — вечар чытачоў з удзелам БелАПП'у. Праграма — дакл. аб беларускай пралет. культуры і літаратуры. Мастацкая перадача твораў расійскіх пісьменьнікаў — Караваевай, Інбэрг, С. Сямёнава, Маякоўскага, Шышкова, Л. Талстога і Дастаеўскага. Білеты па біб-ках.

ЗАЎТРА

Дом Асьветы. Прызначаны на 11 мая вечар памяці **У. Маякоўскага** адбудзецца 14 мая ў 20 гадз. Білеты сапраўдны.

Клюб саматужнікаў (Ракаўская, 13). Вечар пісьменьніка М. **Рэйзмана,** які прыехаў з Масквы і прачытае ўрывак з раману: «Минус 6», урывак з новага раману «Эти господа», а таксама новыя нарысы з побыту беларускіх саматужнікаў. Пачатак у 19 гадз.

Клюб саўгандальспужачых. Склік. 3-я група Фрунз. раён. дэлег. сходу. У гэты-ж дзень і гадзіну ў клюбе працасьветы 1-я група. Яўка дэлег. абавязкова.

Дом Камсамолу (2 паверх, чыт.). Мен. АК, КРК і Фр. РК КСМ склікаюць нараду апорграў і масавых працаўнікоў [illegible] на пытаньні падрыхтоўкі і правядзеньня палітбюю. Яўка абавязкова.

Навуковая асацыяцыя. 16-га мая у 20 з палов. гадз. прафэсар **Эльбэрт** прачытае на радыё лекцыю для вучасткових дактароў аб прымітэках.

— 19-га мая ў 20 з палов. гадзін — радыё-лекцыя праф **Бурака** «Ангіна».

Да ведама членаў саюзу мэдсанпрацы. Члены саюзу мэдсанпрацы, якія жадаюць паехаць у далёкія экскурсіі (Крым, Каўказ, Урал) і блізкія (у межах БССР) могуць запісацца штодзенна ў бі-цы клюбу «Мэдпрацаўнік» з 13 да 15 гадз. і з 19 да 22 гадз. Апраўкі таксама.

Бюро даведак для паступаючых ва унівэрсытэт. Пры выканбюро прафэсцый БДУ арганізавана бюро даведак для паступаючых ва унівэрсытэт, якое працуе з 17 — 19 гадз. На пісьмовыя запытаньні абавязкова прыкладаць марку для адказу. (Адрас: Выканбюро БДУ, хэмкорпус, пакой 14).

Да ведама хатніх работніц. Хатнія работніцы, якія ад'яжджаюць на дачы, павінны ўзяцца на вучот у сваіх мясцкомах.

Адказны рэдактар Як. АСЬМОУ.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б
СКЛІКАЕ
17 мая а 7 гадз. увеч. **НАРАДУ** ўпоўнаважаных па „Зьвязьдзе"
Упоўнаважаныя ад іншых сходаў і нарад у дзень гэтае нарады
вызваляюцца
Нарада адбудзецца ў памяшканьні райкому.
Райком КП(б)Б.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Сёньня, 13 мая адкрыты спэктакль
„АВАНГАРД" В. Катаеў
п'еса ў 4-х дзеях 16 малюнках,
Пастаноўка Сяргея РОЗАНАВА і К. САНЬНІКАВА
Мастак Ю. ГОЛЬЦ. Музыка Ул. САКАЛОВА.
Пачатак а 8 гадз.
Прызначаны на 12 мая адкрыты спэктакль пераносіцца на 14 мая

Сад „ПРАФІНТЭРН" 15-га (адчыненьне) 17 і 18 мая | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР 16 і 19 мая
ПЯЦЬ ГАСТРОЛЯЙ МАСКОЎСКАГА БАЛЕТУ
„ИСКУССТВО ТАНЦА"
імя Веры МАЙЯ.
Білеты ў касе тэатру і ў рабкасе. | Пачатак а 9 г. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
ЗАВАЯВАНАЯ ЗЯМЛЯ
Вытворчасьць Белдзяржкіно
Мастацкі фільм ў 5 частках.
Кіно-штомесячнік Белдзяржкіно
„Беларусь Савецкая" № 5.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гастролі народнай кітайскай трупы
ЛЮ-КУМ-ХАЙ **нябачнае відовішча.**
Білёт на месах. 100 пірузтаў у паветры і г. д.
Пачатак а 7 г. увеч.—КАСА—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал
Замежны мастацкі фільм
АПОШНІЯ НАВІНЫ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
КАЛМЫКІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

КІНО Пралетары
Новы мастацкі фільм
Вытворчасьці АРМЕНКІНО
ПАД ЧОРНЫМ КРЫЛОМ
у 6 частках
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
КУЛЬТУРФІЛЬМ
НУРЫ
у 6 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена—ад 12 г. дня.

КІНО Спартак
ПАТ І ПАТАШОН
у фільме **ПАЛІЦЭЙСКІЯ** кам. у 6 частк.
Пачатак сэансаў: 7 г. 15 м., 9 г. 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

Усім саўгасам, калгасам, аграномам, дасьледчым установам раіцца набыць кнігу для правядзеньня навуковых досьледаў з угнаеньнямі
Г. ЧУЙКО. Як ставіць навуковыя досьледы ў саўгасах і калгасах.
Стар. 52. Цана 15 кап. БДВ 1930 г
Прадаецца ва ўсіх кнігарнях БДВ і кніжных крамах і кіёсках Белкаапсаюзу.

ЗЬБІРАЙЦЕ ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ!
Вучні школ і піянэр-атрады! Арганізуйце брыгады па зборы лекавых траў. Не давайце гінуць у палёх сотням тысяч рублёў!
Збор лекавых траў—
ДОБРЫ ЗАРАБОТАК
для дзяцей беднаты.
Белмэдгандаль у бягучым годзе, як і ў мінулыя гады, **ПРАЗ УСЕ АПТЭКІ** ў раёнах і ў гарадох Беларусі купляе высушаныя лекавыя расьліны: валер'ян, белену, талакнянку, бялянку, палынь (ліст), ліпавы цьвет, чарніцы, ліканодзі (дзераза), маліну сушаную, ядловец (ягады), спарыньню (чорныя ражкі жыта), дуброўку—корань, крапіўны ліст, кару крушыны, кмен, смарчкі, хвалёвыя пупышкі, рабіны (ягады), адуванчык (корань), мурашканыя яйкі, канюшыну чырвоную, аерны корань
АЧЫШЧАНЫ.
Па ўсіх пытаньнях зварачацца ў бліжэйшую аптэку.
Белмэдгандаль, Менск, Пляц Волі, 29.

КОЙДАНАЎСКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ
ПАТРАБУЮЦЦА БУХГАЛЬТАР і РАХУНКАВОД
1-ы з акладам да **175 р.**, 2-гі з акладам да **100 р.**
Заявы накіроўваць: **Койданава, машына-трактарная станцыя.**

БЕЛКАМУНБАНКУ (МЕНСК)
патрабуюцца ЭКАНАМІСТЫ
з фінансавым стажам, тэхнік-будаўнік.

ПАТРЭБНЫ КАРЭКТАРЫ,
якія добра ведаюць бел. мову.
Зварочвацца у к-р'у газ. „Зьвязда"

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА — УЗВЕМАДАЦНАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялягічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
**Прыём хворых па л